Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№225 (28589)
22 ЛІСТАПАДА 2017 г. СЕРАДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
стар. 9–16



**Ці быў Скарына ў Малдавіі?**
СТАР. 5



**Цяжка дрэву ў горадзе**
МС



**Сельская гаспадарка на новы лад**
МС

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Валянціна РАЖАНЕЦ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі:**

*«Абарона правоў і законных інтарэсаў людзей, работа са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб — найважнейшыя задачы краіны. У рабоце дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў яны таксама маюць вялікае значэнне. Мы праводзім прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі, сустрэчы з насельніцтвам па месцы жыхарства і ў працоўных калектывах. Пытанні, якія паступаюць, аналізуюцца і часам становяцца асновай для ўнясення карэкціровак у існуючыя заканадаўчыя акты».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.11.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0047 | ▲ |
| Еўра | 2,3539 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0337 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0755 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# Вясна яшчэ вернецца!




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

76–гадовая Марыя Аляксееўна ЗАРУБІЦКАЯ з вёскі Манголія Сенненскага раёна – апошні і адзіны яе жыхар...

■ Грошы

## Музейшчыкі будуць атрымліваць больш

### Работнікам культуры і сацабслугоўвання са снежня павысяць заробкі

**Гэта прапісана ў пастанове Савета Міністраў ад 20 лістапада 2017 года №863. Памер павышэння акладаў супрацоўнікаў устаноў сацыяльнага абслугоўвання і культурна-асветніцкіх арганізацый павялічыцца з 15 да 25 працэнтаў, паколькі ў адпаведных галінах назіраецца найбольш нізкі памер заробкаў у параўнанні з іншымі бюджэтнымі сферамі. Дадзенае павышэнне ўстанаўліваецца толькі тым, чые працоўныя функцыі адпавядаюць асноўнаму віду дзейнасці ўстаноў (напрыклад, не будзе датычыцца прыбіральшчыц у музеях).**

Дакументам таксама прадугледжана змяненне дыяпазону карэктуючых каэфіцыентаў, якія прымяняюцца да тарыфных ставак. Гэта дазволіць павысіць узровень аплаты працы работнікаў, якія тарыфікуюцца 1—17-м разрадамі. Пры гэтым у большым памеры павялічацца заробкі нізкааплатных катэгорый работнікаў, якія тарыфікуюцца разрадамі з першага па чацвёрты.

Мяркуецца, што пасля прыняцця мер узровень заробкаў павысіцца ў сярэднім на 7,1 працэнта, а ў аплаце працы будзе забяспечаны збалансаваны рост і захаваецца дыферэнцыяцыя.

Пастанова ўступае ў сілу з 1 снежня. Міністэрству працы і сацыяльнай абароны даручана ўвесці карэктуючыя каэфіцыенты да тарыфных ставак работнікаў бюджэтных арганізацый, памеры якіх вызначаны дадзеным дакументам. Рэспубліканскім органам дзяржкіравання, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, кіраўнікам бюджэтных арганізацый неабходна зрабіць пераразлік заробкаў супрацоўнікаў у адпаведнасці з устаноўленымі каэфіцыентамі і павышэннем акладаў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях „ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!"

## ВЫБУХОВАЯ ХВАЛЯ

### Як не пацярпець ад піратэхнікі?

**Хоць да навагодніх свят яшчэ шмат часу, але ўжо цяпер неба па вечарах прыгожа расквечваецца ад салютаў. Разам з тым піратэхніка можа вельмі сур'ёзна нашкодзіць, калі з ёй абыходзіцца абы-як. Напрыклад, паміж 25 снежня 2016-га і 7 студзеня 2017-га былі траўмаваны 32 чалавекі. З іх — 10 дзяцей. Чорным днём стала першае студзеня. Тады ў бальніцы звярнуліся 25 чалавек, у тым ліку 6 — дзеці. Пра тое, як жа не трапіць на бальнічную койку, карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з афіцыйным прадстаўніком Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі Віталем НАВІЦКІМ.**



### ПЕТАРДА ЛЯЦІЦЬ У ТВАР

Піратэхнічны выраб — гэта фактычна тое ж выбуховае рэчыва. І таму з ім можна працаваць толькі дарослым. Ведама, дзецям таксама хочацца паглядзець на прыгожы феерверк. Але для гэтага трэба іх адвесці на бяспечную адлегласць сама меней у 20—25 метраў. І ні ў якім разе не даваць ім у рукі небяспечную забаўку. Чым гэта можа скончыцца? Гартаю зводку здарэнняў...
СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!
Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# Арыентацыя на людзей

## Прэзідэнт заслухаў даклад па эканоміцы

**Найважнейшыя дакументы дзяржаўнай эканамічнай палітыкі, што вызначаць развіццё краіны ў наступным годзе, абмеркавалі ўчора ў Палацы Незалежнасці. Як адзначыў кіраўнік нашай дзяржавы Аляксандр ЛУКАШЭНКА ва ўступным слове, 2018 год — асаблівы. Краіна павінна будзе пераадолець адставанне, дапушчанае ў 2016 годзе, і выйсці на траекторыю праграмы пяцігодкі.**

### Зрухі ёсць, але не расслабляемся

Сёлета мы назіралі некаторы рост эканомікі, ёсць пазітыўныя зрухі ў яе ключавых галінах. Унутраны валютны рынак вызначаецца ўстойлівасцю, сальда знешняга гандлю становчае. Мы нарасцілі золатавалютныя рэзервы, аднаўляем аб'ёмы экспарту.

— Тым не менш падстаў для самазаспакаення быць не можа, — лічыць кіраўнік дзяржавы. — Эканоміка за 2015—2016 гады згубіла 6%. Сёлета адыгралі толькі 2%, чаго відавочна недастаткова. Узнікае заканамернае пытанне: чаму пры росце валавога ўнутранага прадукту няма росту даходаў насельніцтва? Нават за два гады мы не аднавілі ўзровень, які быў у канцы мінулай пяцігодкі. Ды і з выкананнем майго даручэння па дасягненні сярэдняй заработнай платы ў 1000 рублёў шмат пытанняў і праблем.

Па-ранейшаму актуальная тэма занятасці. Аляксандр Лукашэнка зазначыў, што ўрад дакладвае аб 50 тысячах новых працоўных месцаў. Але ў той жа час, па статыстыцы, колькасць звольненых перавысіла колькасць прынятых на працу на 43 тысячы чалавек.

— Мы павінны пранікнуцца пачуццём таго, што кожны чалавек мусіць мець магчымасць працаваць, — заявіў падчас учарашняга мерапрыемства кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што, сапраўды, ёсць людзі, якія стаяць на ўліку ў міліцыі, — і з імі работа арганізавана па-іншаму. Але тым людзям, якія зацікаўлены ў працы, трэба дапамагчы.

### Інфляцыя і інвестыцыі

Нацыянальны банк інфармуе, што ў бягучым годзе мы дасягнём самага нізкага за ўсю гісторыю незалежнай Беларусі росту цэн.

— 6% па выніках 2017 года — цудоўна, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Аднак у планах на 2018 год прадугледжана павелічэнне да 7%. Якія падставы для гэтага? Мы гаворым пра інфляцыйныя чаканні, у той жа час самі ж падганяем іх.

Насцярожвае кіраўніка краіны сітуацыя і ў сферы інвестыцый:

— Па маёй інфармацыі, на наступны год іх запланавана ажно 65% ад узроўню 2011 года. Гэтага недастаткова нават для простага падтрымання канкурэнтаздольнасці эканомікі. Калі няма ўласных капіталаў, трэба шукаць і прыцягваць інвестараў. Яны ёсць. І крэдыты прымальныя таксама. Але, дзіўна, праектаў няма.

### Бюджэт — не мыліца

Гаворачы пра сферу фінансаў, у першую чаргу Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да бюджэту на наступны год. Патрабаванне Прэзідэнта, як і да бюджэтаў ранейшых гадоў, — служэнне сацыяльнай палітыцы.

— Чаму бюджэт ператвораны ў мыліцу для прадпрыемстваў, якія кульгаюць? І паток прапаноў ад урада па вырабе гэтых мыліц на ўзроўні Прэзідэнта не спыняецца.

Па-другое, кіраўніка краіны насцярожвае праблема даўгоў у рэальным сектары:

— Доля праблемных актываў высокая. Як на гэта глядзіць урад? Нацыянальны банк? Ці гэта зноў будзе перакладзена на бюджэт краіны? Большасць мер, якія прымаюцца, пакуль носяць касметычны характар, а патрэбны сістэмныя рашэнні.

Аляксандр Лукашэнка даў даручэнне рыхтаваць праект бюджэту для ўнясення ў Палату прадстаўнікоў.

— Работа тут праробленна добрая, усё пралічана нармальна, у асноўным усё правільна сказана. Адзінае, што я скажу: зазямліцеся. Саскочце з верхатуры на зямлю. Людзі хочуць нармальна жыць. Вы паглядзіце, што ў нас пенсіянеры маюць. Што ў нас мае сярэдні медыцынскі персанал. Нават урачы. На іх жа краіна трымаецца, — падкрэсліў Прэзідэнт. Адначасова, упэўнены ён, неабходна на нечым зэканоміць, але павялічыць зарплату гэтым людзям.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

**У тэму**

**Як паведаміла падчас нарады кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА, у найбліжэйшы час будзе ўнесена на разгляд кіраўніка дзяржавы новая канцэпцыя Дэкрэта №3.**

«Мы аналізуем гэту сітуацыю, яна сапраўды сур'ёзная, — сказала кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Тыя даныя, якія нам прадставілі аблвыканкамы, — гэта каля 500 тысяч непрацуючых чалавек».

Створана спецыяльная маніторынгавая група, якая рэгулярна выязджае ў найбольш праблемныя з пункту гледжання беспрацоўя рэгіёны. «Мы бачым, што гэта асноўнае пытанне, якое хвалюе жыхароў нашай краіны. У розных рэгіёнах сітуацыя розная, але яна сапраўды сёння мае месца, і самазаспакойвацца тут нельга», — падкрэсліла Наталля Качанава.

■ Знешняя палітыка

# НОВЫ СТАН ПАРТНЁРСТВА

**Дэлегацыю нашай дзяржавы на саміце «Усходняга партнёрства» ў Бруселі (24 лістапада) узначаліць міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ. Пра гэта паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі МЗС Андрэй ШУПЛЯК, адказваючы на пытанне карэспандэнта БЕЛТА.**

«Беларускім бокам з удзячнасцю ўспрынята запрашэнне наведаць саміт на ўзроўні кіраўніка дзяржавы, — сказаў Андрэй Шупляк, — што адлюстроўвае прагрэс у адносінах Беларусі з ЕС і перахо, пасля доўгага перыяду рознагалоссяў, у новы стан узаемадзеяння з ЕС як вельмі важным суседам, партнёрам па рашэнні пытанняў міжнароднай бяспекі ў еўрапейскім рэгіёне і па пашырэнні гандлёвага і інвестыцыйнага ўзаемадзеяння краін ЕС з Беларуссю».

У дыпламатычнай практыцы, адзначыў прадстаўнік знешнепалітычнага ведамства, візіт на найвышэйшым узроўні, як правіла, з'яўляецца кульмінацыяй узаемных намаганняў бакоў па развіцці супрацоўніцтва.

Беларусь зацікаўленая ў працягу ўдзелу ва «Усходнім партнёрстве» ЕС. Ён павінен стаць відавочна карысным для грамадзян Беларусі і ЕС, палегчыўшы ўмовы вядзення бізнесу, кантакты паміж людзьмі, сувязі ў розных сферах, падвысіўшы ўзровень аб'ектыўных ведаў адно пра аднаго.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Кіраўнікі МЗС Кітая, Германіі і ЕС абмеркавалі сітуацыю на Карэйскім паўвостраве



Міністр замежных спраў КНР Ван І сустрэўся паасобку з кіраўніком МЗС ФРГ Зігмарам Габрыэлем і кіраўніком еўрапейскай дыпламатыі Федэрыка Магерыні, з якімі абмеркаваў сітуацыю на Карэйскім паўвостраве і пытанне ядзернай праграмы Ірана, гаворыцца ў паведамленні МЗС КНР. Гэта адбылося ў сталіцы М'янмы Нейп'ідо ў рамках міністэрскай сустрэчы «Азія-Еўропа». Паведамляецца, што бакі таксама абмеркавалі праблему штата Ракхайн паміж М'янмай і Бангладэш. Раней Расія і Кітай прапанавалі КНДР аб'явіць мараторый на ядзерныя выпрабаванні і пускі ракет, а Паўднёвай Карэі і ЗША — устрымацца ад правядзення вучэнняў у рэгіёне для стабілізацыі сітуацыі на паўвостраве, але ў Вашынгтоне гэтую ініцыятыву праігнаравалі.

### Турцыя не плануе разрываць сувязі з НАТА

Пра гэта заявіў афіцыйны прадстаўнік прэзідэнта Турцыі Ібрагім Калын. Новы віток напружанасці ў адносінах Анкары і НАТА паўстаў 18 лістапада. Тады прэзідэнт Турцыі Рэджэп Эрдаган заявіў, што на штабных вучэннях альянсу ў Нарвегіі партрэт першага прэзідэнта Турэцкай Рэспублікі Мустафы Кемаля Атацюрка і імя самога Эрдагана выкарыстоўваліся для абазначэння ўмоўнага праціўніка. З-за гэтага 40 турэцкіх вайскоўцаў былі адкліканы з вучэнняў. Кіраўнік міністэрства абароны Нарвегіі папрасіў прабачэння перад Турцыяй і адзначыў, што шкадуе аб тым, што здарылася. Свае прабачэнні таксама прынёс генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг.

### Польшчу абавязалі плаціць штраф за высечку Белавежскай пушчы

Польшча павінна будзе плаціць Еўракамісіі 100 тыс. штрафу штодня, пакуль не спыніць высечку Белавежскай пушчы. Пра гэта гаворыцца ў пастанове суда Еўрасаюза. «Польшча павінна неадкладна спыніць актыўнае лесакарыстанне ў Белавежскай пушчы, за выключэннем выпадкаў, калі гэта строга неабходна для гарантавання грамадскай бяспекі», — адзначаецца ў дакуменце. Скандал вакол Белавежскай пушчы працягваецца ўжо некалькі месяцаў. Па планах урада Польшчы, высечцы ў запаведніку падлягаюць каля 1,3 млн дрэў, заражаных небяспечным шкоднікам — караедам-тыпографам. Экологі пратэстуюць супраць гэтых дзеянняў і патрабуюць даць магчымасць рэліктаваму лесу самастойна справіцца з натуральнымі працэсамі абнаўлення масіву.

### Названы найлепшыя гаджэты



Гульнявая прыстаўка Switch ад японскай кампаніі Nintendo ўзначаліла рэйтынг найлепшых тэхнічных навінак 2017 года, па версіі часопіса Time. Аб гэтым паведамляецца на сайце выдання. Кансоль, якая складаецца з планшэта з 6,2-цалевым экранам і геймпадаў Joy-Con, якія дазваляюць ператварыць прыстаўку ў стацыянарную прыстаўку, абагнала iPhone X, які заняў другое месца. На думку аўтараў артыкула, навінка ад Apple, нягледзячы на дарагоўлю і складанасць, стварыла новы стандарт для смартфонаў будучыні. Тройку замкнуў ноўтбук Microsoft Surface з «яго лёгкім і элегантным дызайнам, вострым экранам і доўгавечнай батарэяй».


**ОАО «Гомельоблреклама», филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Ветковский КБО» (продавец) извещает о проведении 7 декабря 2017 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без НДС (20%), бел. руб. | Сумма задатка, без НДС (20%), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение с инв. №311/D-8394**, площадью **1 139,4 кв. м,** назначение – коммунально-бытовое помещение, наименование – **помещение**. Местонахождение: **Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Ленина, 2.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **320850100017000008** площадью **0,1816 га (право постоянного пользования)** | **73 150,00** | 3 657,50 |
| 2 | **Изолированное помещение с инв. №311/D-10965**, площадью **444,0 кв. м,** назначение – помещение бытового обслуживания населения, наименование – **помещение КБО**. Местонахождение: **Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Луначарского, 22/1.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **320850100019000061** площадью **1,3863 га (право постоянного пользования)** | **16 700,00** | 835,00 |
| 3 | **Изолированное помещение с инв. №311/D-8912**, площадью **227,6 кв. м,** назначение – магазин, наименование – **магазин**. Местонахождение: **Гомельская обл., Ветковский р-н, Приснянский с/с, д. Присно, ул. Советская, 2.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **320884001601000149** площадью **0,1054 га (право постоянного пользования, 43/100 доли)** | **15 250,00** | 762,50 |

**Продавец:** ОАО «Ветковский КБО», г. Ветка, ул. Ленина, 2. Конт. тел. 8 (029) 690-00-10 – Беланов Руслан Николаевич (ликвидатор предприятия). **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. ПРИМЕЧАНИЕ: Реализация имущества осуществляется без НДС. Для участия в аукционе необходимо:**
**1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY34 BAPB 3012 2093 7001 3000 0000 Филиал ОАО «Белагропромбанк» ГОУ, БИК BAPBBY23912, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления);
**2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 22 ноября 2017 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 5 декабря 2017 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** торгов в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 №607). **Подробное извещение опубликовано в газете «Белорусская Нива» («Сельская газета») от 13.06.2017 г. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы».**



**Приглашение**

**Унитарное предприятие Национального олимпийского комитета Республики Беларусь «Спортивно-оздоровительный комплекс «ОЛИМПИЙСКИЙ» проводит аукцион №134 по продаже права заключения договора аренды изолированного нежилого помещения сроком на три года**

**Аукцион состоится 26 декабря 2017 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 2а, конференц-зал. Документы на участие принимаются по 22 декабря 2017 года до 15.00 включительно по адресу: 220012, г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.**

**Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Телефоны для справок: (017) 290-49-06, 290-47-18, 290-49-11. Интернет: www.dvs.by.**

Организатор аукциона (продавец) – УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ», г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.

| | Предмет аукциона (право заключения договора аренды), цель использования помещения | Площадь, м² | Начальная цена продажи |
|---|---|---|---|
| | **г. Минск, ул. Сурганова, 2** | | |
| 1 | БЛОК ПОМЕЩЕНИЙ:<br>Изолированное нежилое помещение №17 на 1-м этаже (под офис)<br>Изолированное нежилое помещение №18 на 1-м этаже (под офис) | 16,1<br>16,4<br>Общая площадь 32,5 | 61,18<br>62,32<br>Общая цена 123,5 |

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота, **расчетный счет BY44BAPB30122082500180000000, ОАО «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, БИК BAPBBY2X, УНП 101 508 270, УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ».** Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. №1049.

Оплата права заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом на расчетный счет организатора аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения.

Победитель аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан возместить УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона.

■ «Дакар-2018»

# МАЗ супраць бездарожжа Перу

**Каманда «МАЗ-СПОРТаўта» прыме ўдзел у 40-м ралі-марафоне «Дакар-2018», які пройдзе з 6 па 20 студзеня 2018 года ў Паўднёвай Амерыцы. На ралі па бездарожжы адправяцца тры экіпажы на гоначных МАЗах. Чакаецца, што юбілейны «Дакар» стане самай складанай гонкай за апошнія гады. Працягласць хуткасных участкаў складзе каля 4 тысяч км, што з'яўляецца рэкордным паказчыкам. Усяго ж удзельнікам на сваіх баявых машынах трэба будзе праехаць больш за 9 тысяч км. У праграме, як заўсёды, запланаваны этапы з дзюнамі, горнымі перавaламі і саланчакамі. Упершыню пасля шматгадовага перапынку марафон вернецца ў Перу, дзе пройдуць стартавыя этапы. Далей гонка працягнецца ў Балівіі і Аргенціне.**

У беларускую каманду ўвайшлі гоншчыкі, якія ўжо прадстаўлялі краіну на папярэдніх заездах «Дакара» і «Шаўковага шляху». Баявыя машыны 503, 512, 518 былі назначна мадыфікаваны: спецыялісты дадаткова папрацавалі над рухавікамі і трансмісіяй. Па словах **начальніка каманды «МАЗ-СПОРТаўта» і пілота экіпажа машыны 512 Сяргея ВЯЗОВІЧА** з кожным годам трасы ралі-рэйдаў становяцца складанейшыя. «Праціўнікі таксама адаптуюцца. Ужо даўно не толькі КАМАЗ з'яўляецца адной з самых складаных з пункту гледжання канкурэнцыі камандаў. Экіпажаў, якія прэтэндуюць трапіць у топ-3, каля 18. Ім па сілах пры поўных абставінах дамагчыся добрых вынікаў. Паглядзім, што будзе ў Перу», — сказаў Сяргей Вязовіч.

Ён таксама падкрэсліў, што машыны да «Дакар» рыхтуюцца спецыфічна. Раскрываць усе нюансы ў зменах канструкцыі аўто да старту гонкі ён не стаў, але адзначыў, што гэтыя змены ёсць, хоць і неістотныя. «Магу запэўніць, што ў нашай камандзе механікі здольныя ліквідаваць любую праблему вельмі хутка. Мы тэхнічна ўжо гатовыя. Члены экіпажаў працягнуць трэніравацца, нам трэба будзе працаваць над фізічнай падрыхтоўкай, а таксама прайсці адаптацыю да ўмоў высакагор'я, якія чакаюць нас у Балівіі. На працягу ўсяго снежня мы будзем рыхтавацца», — сказаў пілот экіпажа.

Кажучы пра магчымасці МАЗаў, ён таксама паведаміў, што па чыстай хуткасці беларускія аўто могуць змагацца з любой камандай. Асноўнае пытанне — у складанасці падтрымання аўтамабіля ў аднолькавым стане ад старту да фінішу. «Але досвед, які мы назапашваем, ужо блізкі да таго, каб мы маглі ўсё ўлічыць. Задача заключаецца ў тым, каб прадбачыць паломку і памяняць яшчэ спраўную дэталь крыху раней, чым яна выйдзе са строю. Тут толькі вопыт і гады могуць дапамагчы», — рэзюмаваў Сяргей Вязовіч.

**Намеснік генеральнага дырэктара — камерцыйны дырэктар Генадзь СКІТАЎ** падкрэсліў, што, нягледзячы на тое, што завод МАЗ сёння працуе ўсё яшчэ не ў поўную сілу, каманду «МАЗ-СПОРТаўта» будзем развіваць і падтрымліваць. «Што датычыцца завода, то мы нарошчваем абароты. Прынята рашэнне адмяніць усе адпачынкі за свой кошт. На 2018 год па аўтобусах мы законтрактаваныя на бліжэйшыя чатыры месяцы. Спартыўная каманда дапамагае нам у рэалізацыі маркетынгавых задач, што станоўча ўплывае на продажы», — расказаў Генадзь Скітаў.

Сярод канкурэнтаў нашых гоншчыкаў вядомыя каманды. КАМАЗ выставіць на гонку адразу чатыры экіпажы. Таксама ў ралі прыме ўдзел каманда Petronas Iveco, MAN, Tatra і Renault.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

# ВЫБУХОВАЯ ХВАЛЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Увечары 2 студзеня ў прыёмны пакой Брэсцкай абласной бальніцы звярнуліся бацькі двухгадовага хлопчыка. Урач дыягнаставаў у малога апёк правай шчакі. Дзіця тут жа шпіталізавалі. Пасля высветлілася, што апёк быў атрыманы з-за элемента феерверку суткамі раней.

А ўвечары 1 студзеня ў прыёмны пакой ужо Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы прыйшла шасцігадовая дзяўчынка. Як яна растлумачыла, ёй у твар прыляцела петарда. З дыягназам «тэрмічны апёк ілба трэцяй ступені» яе шпіталізавалі.

У навагоднюю ноч на пульт дыспетчара Магілёўскай гарадской бальніцы паступіла паведамленне, што ў двары прыватнага дома ўзарвалася хлапушка і пацярпела трохгадовае дзіця. Маці пасля расказала, што хлопчык трымаў хлапушку ў руках, дзе яна і выбухнула.




## САЛЮТ У КВАТЭРЫ

Паняцце вытворчага браку прымяняльна не толькі да бытавой тэхнікі, але і да піратэхнічных вырабаў. Здаецца, усё зроблена па інструкцыі — і ўсталявалі правільна, і падпалілі, і адбеглі... але ў паветра нічога не паляцела. «Асечка» — думае чалавек і ідзе разбірацца, што ж там здарылася. І тут па законе подласці петарда спрацоўвае. Што далей? Тугавухасць, траўмы вока, пераломы пальцаў...

Трынаццацігадовы падлетак — жыхар пасёлка Пуцяводная Зорка Гомельскага раёна — незадоўга да леташніх навагодніх свят знайшоў на вуліцы неразарваную петарду. Паспрабаваў яе падпаліць. А яна ўзяла ды і выбухнула ў руках. Школьніка прывезлі ў рэанімацыю Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы са скалечанай левай рукой. Два пальцы на ёй выбуховая хваля пераламала, а трэці і ўвогуле адарвала.

— Часцей за ўсё, калі петарда не спрацавала, трэба не кідаць яе на волю лёсу, а пачакаць 20—25 хвілін і пасля засыпаць пяском або снегам, — раіць Віталь Навіцкі. — Але ўніверсальнага алгарытму дзеянняў у такіх выпадках не існуе. Справа ў тым, што рэцэптура піратэхнічных вырабаў вельмі разнастайная. Нейкія рэчывы могуць уступаць у хімічную рэакцыю з вадой, нейкія — не. Усе гэтыя нюансы павінны быць абавязкова распісаны ў інструкцыі.

Петарды, ракеты, салюты могуць не запусціцца і з-за таго, што яны няправільна захоўваліся. Класці каробку з выбухоўкай на балкон нельга — там вільготна і холадна. Але і ад крыніц ацяплення таксама трэба трымаць далей, каб не адбылася дэтанацыя. Зрэшты, дэфіцыту прапановы піратэхнікі ў краіне не назіраецца, і таму закупляцца ёй загадзя сэнс невялікі...

Набываць такі патэнцыйна небяспечны для здароўя тавар трэба выключна ў легальных пунктах продажу. Гэта стане гарантыяй, што піратэхніка прайшла праз усе неабходныя выпрабаванні і ў яе ёсць усе сертыфікаты. Да таго ж яна камплектуецца інструкцыяй на беларускай або рускай мовах, дзе прыведзены адказы на ўсе магчымыя пытанні, якія могуць узнікнуць пры яе выкарыстанні: як запускаць, як захоўваць, як утылізаваць і што рабіць, калі яна не спрацавала. Цікава, што «шэрая» піратэхніка каштуе абсалютна столькі ж, колькі і ў добрасумленных крамах. Але пры гэтым такія прадаўцы трапляюцца падчас спецыяльных сумесных рэйдаў кожны год. Калі ёсць продаж — значыць, ёсць попыт. Але ў чым тады яго сэнс?

Што да адлегласці, то пры запуску ракет і петардаў да будынкаў і аўтамабіляў павінна быць не менш за 20 метраў. А вецер мусіць быць не мацнейшы за 3—4 метры за секунду, інакш траекторыя палёту стане непрадказальнай. Летась у Мінску быў выпадак, калі ў адну ноч петарды падпалілі аўтамабіль і балкон кватэры. Таму лепш за ўсё адправіцца з піратэхнікай не ў двор, а на бязлюдную пустку. І вядома ж, побач не павінна быць дрэў і ліній электраперадачы. Цікава, што петарда можа здэтанаваць нават ад трасення падчас пераноскі ў кішэні.

Адметна, што ў гэтым годзе з-за выкарыстання піратэхнікі здарыўся ўсяго адзін пажар. Было гэта 27 студзеня ў вёсцы Пекалін Смалявіцкага раёна. Ішоў дым з акна жылой кватэры двухкватэрнага дома. Ратаўнікі прыйшлі на дапамогу чатыром чалавекам, сярод якіх былі двое дзяцей. Ніхто не пацярпеў. Але агонь пашкодзіў тэхніку і мэблю і закапціў сцены. Прычынай пажару, як пазней высветлілася, стаў самаробны салют, які стаяў каля батарэі ацяплення. Хутчэй за ўсё, ён спрацаваў з-за цеплавога ўздзеяння.

## АПЁКІ МОГУЦЬ БЫЦЬ І ХІМІЧНЫЯ

— Важна правільна распазнаць тып апёку, — кажа Віталь Навіцкі. — Зрабіць гэта можна толькі візуальна па ўчастку пашкоджанай скуры. Калі скура пачырванела, то апёк яўна тэрмічны. Алгарытм дзеяння просты — ахаладзіць гэтае месца вадой, закрыць яго тканінай і накласці чыстую павязку. А вось калі колер скуры становіцца ненатуральным, то, хутчэй за ўсё, апёк ужо хімічны. Магчымасць яго ўзнікнення ўзрастае пры блізкім кантакце з піратэхнікай. Калі ракета ўзарвалася на старце, то, хутчэй за ўсё, чалавек атрымае апёк камбінаваны — і тэрмічны, і хімічны. Пры любой шкодзе ад піратэхнікі трэба звяртацца па дапамогу да ўрача. Хоць бы для таго, каб проста перастрахавацца.

Нават уздзеянне святла і гуку на органы пачуццяў можа не прайсці бяскрыўдна. Напрыклад, ноччу на 1 студзеня толькі ў Мінску два маладыя мужчыны атрымалі кантузію вока 1-й і 2-й ступеняў.

Між іншым, небяспеку ўяўляе сабой і бенгальскі агонь. На першы погляд падаецца, што прыгожыя іскры, якія так падабаюцца людзям у паўзмроку, цалкам бяспечныя. Але гэта далёка не так. Справа ў тым, што іскры з'яўляюцца дзякуючы таму, што гарыць магній. Калі часцінкі гэтага распаленага металу трапяць на скуру, то гарантаваны адразу два тыпы апёкаў — хімічны і тэрмічны. Таму працаваць з піратэхнікай можна толькі выключна цвярозаму чалавеку. Бо ў такой справе, як і падчас кіравання аўтамабілем, патрабуецца вельмі пільны кантроль.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*


КУП по оказанию услуг «**Гродненский центр недвижимости**» сообщает, что **в объявление об открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Гроднопромстрой»,** который состоится **12 декабря 2017 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1** внесены следующие дополнения и изменения:

позиция «**Предмет аукциона**» дополнена – капитальное строение инвентарный номер 400/С-7023 (опалубочный цех) общей площадью 398,7 кв. м (2-этажное здание. Материал стен – кирпич. Год постройки – 1973);

позиция «**Кадастровый номер земельного участка и размеры**» дополнена – 440100000001003240 площадью 0,1151 га;

позиция «**Начальная цена продажи**» изменена – **812 745,48 рублей** (с учетом НДС 20%);

позиция «**Сумма задатка**» изменена – 81 274,55 рублей.

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет №57, в рабочие дни с 8.00 – 13.00 и 14.00 – 17.00 **по 6 декабря 2017 года.**

Телефоны для справок в Гродно: (0152) 72 05 37, 74 20 95.

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

УНП 590727594



Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | «Белэксимгарант», г. Минск, ул. Мельникайте, д. 2, пом. 1 |

**Предмет аукциона**

| Лот № | Наименование | Начальная цена, без НДС | Месторасположение |
|---|---|---|---|
| **1** | Легковой автомобиль МАЗДА MPV, рег. номер 8024 АЕ-7, кузов №JMZLW19F210106556, год выпуска 2000 | 1 538,10 | Автостоянка №65 г. Минска, ул. Горецкого, д. 6 |
| **2** | Легковой автомобиль МАЗДА-6, рег. номер 9659 ЕЕ-7, кузов №JMZGG143681706810, год выпуска 2007 | 2 772,94 | г. Барановичи, ул. Ленина, д.11-4 |
| **3** | Легковой автомобиль SKODA OCTAVIA, рег. номер 9823 РС-7, кузов №TMBCK11U732723030, год выпуска 2002 | 452,31 | г. Минск, пр-т Победителей, д. 21 |
| **4** | Легковой автомобиль MAZDA-6, рег. номер 9468 НЕ-7, кузов №JMZGG12F531123690, год выпуска 2002 | 1 022,37 | г. Молодечно, ул. Т. Дудко, д. 3 |
| **5** | Легковой автомобиль ВАЗ-21093-21, рег. номер 7267 АА-2, кузов №XTA21093043672200, год выпуска 2004 | 283,98 | Витебский р-н, Р-21, стоянка для большегрузных автомобилей, 10 км справа |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата с учетом НДС должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **27.12.2017** в 11.0 по адресу**: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **22.12.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by |



Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Гомельдрев», г. Гомель, ул. Достоевского, 3 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Достоевского, 3**

| № Лота | Инв. № | Наименование | Начальная цена с НДС 20%, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 4264 | Пожарная машина ZIL-431412 АЦ40, год выпуска 1991, рег. №3293ГСП | 4 200,00 |
| 2 | 3532 | Пожарная машина ZIL-431412 АС40, год выпуска 1990, рег. №9575ГСО | 4 200,00 |
| 3 | 7928 | Пожарная машина ZIL-131 АС40, год выпуска 1984, рег. №9840ГСА | 7 080,00 |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | 10 рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **24.12.2017** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **22.12.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by |

■ Падрабязнасці

# «ГЭТА БЫЛО ЯК СТРАШНЫ СОН»

**У інтэрнэце вялікі рэзананс выклікаў дзёрзкі напад на аддзяленне Беларусбанка, які адбыўся ў панядзелак у Магілёве. Злачынца захапіў заложнікаў, пагражаў ім пісталетам, ставіў праваахоўнікам умовы, каб далі магчымасць яму ўцячы. Але быў затрыманы і цяпер знаходзіцца пад арыштам. Група інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Магілёўскага аблвыканкама падзялілася падрабязнасцямі.**



Сігнал «трывожнай кнопкі» паступіў у Ленінскі аддзел Дэпартамента аховы Магілёва ў 14.41, а праз тры хвіліны па лініі «102» супрацоўніца банка паведаміла, што ў злачынцы ёсць агнястрэльная зброя, ён страляе і патрабуе грошы. Тым часам нарад затрымання Дэпартамента аховы ўжо блакаваў падыходы да аддзялення банка і прылеглую тэрыторыю. Але пры спробе супрацоўніка нарада ўвайсці ў памяшканне мужчына ў масцы накіраваў на яго падобны на пісталет прадмет і запатрабаваў выйсці на вуліцу. На падлозе ў філіяле ляжалі 12 заложнікаў.

Пра захват аддзялення банка далажылі міністру ўнутраных спраў, на што быў атрыманы загад не дапусціць прычынення шкоды жыццю людзей. Групу затрымання АМАП узначаліў **начальнік упраўлення ўнутраных спраў генерал-маёр міліцыі Аляксандр КАВАЛЬЧУК.** Зламыснік запатрабаваў перагаворшчыка, які павінен быў быць без верхняга адзення. Пад выглядам супрацоўніка службы бяспекі банка ў аддзяленне ўвайшоў першы **намеснік начальніка УУС палкоўнік міліцыі Аляксандр ВАСІЛЬЕЎ.**



Нападнік патрабаваў ад заложнікаў аддаць мабільныя тэлефоны, якія сабраў у кошык. Пасля таго як зламысніку перадалі грошы, ён загадаў даць яму зброю і аўтамашыну. А яшчэ пажадаў узяць з сабой аднаго з заложнікаў. Аляксандр Васільеў прапанаваў сябе, і мужчына пагадзіўся. Ён загадаў, каб Васільеў сеў за руль і вывез яго за горад. Сам жа размясціўся на заднім сядзенні і прыставіў пісталет да галавы кіроўцы. Калі машына ад'ехала на 400 метраў ад аддзялення банка, захопнік убачыў супрацоўнікаў міліцыі на службовай аўтамашыне і запанікаваў. Ён запатрабаваў, каб тыя спынілі пераслед.

Аляксандр Васільеў, скарыстаўшыся збянтэжанасцю нападніка, пакінуў аўтамашыну.

Той перасеў на пярэдняе сядзенне аўто, каб уцячы, але быў заблакаваны дзвюма службовымі аўтамашынамі. Ён выскачыў з салона і паспрабаваў схавацца ў прыватным сектары. Калі ўбачыў, што за ім бягуць, пачаў страляць. Каб абясшкодзіць уцекача, яго паранілі ў ногі. У 15.34 ён ужо быў затрыманы. Пры ім знаходзіліся заплечнік з грашыма, жорсткі дыск з запісамі камер відэаназірання з аддзялення банка, а таксама пісталет і нож. Першапачаткова мужчына адмаўляўся казаць, хто ён. Толькі прасіў: «Забіце мяне... Не хачу сядзець у турме». Як потым высветлілася, затрыманым аказаўся грамадзянін Расіі 1989 года нараджэння. У 2009—2010 гадах ён праходзіў прызыўную службу ва ўнутраных войсках МУС Расійскай Федэрацыі ва Уладзівастоку, пасля год служыў у ваенізаваным горнавыратавальным атрадзе МНС Расіі ў Магаданскай вобласці. Сёлета прыехаў у Магілёў да маці на пастаяннае месца жыхарства.

У сацыяльных сетках уражаннямі ад захопу падзяліўся Алег, брат аднаго з заложнікаў, які якраз знаходзіўся ў памяшканні аддзялення банка разам з маці. «У той момант, калі пачалося рабаванне, мы размаўлялі па тэлефоне, і брат не стаў адключаць яго нават пасля таго, як злачынец загадаў скласці ў смеццевы кошык усе тэлефоны. Я слухаў усё, што там адбывалася, пакуль не сеў тэлефон — практычна на працягу гадзіны», — расказаў Алег.

Па яго словах, ён не адразу зразумеў, чаму брат перастаў адказваць на яго пытанні. Страшная здагадка дайшла да яго толькі тады, калі на заднім фоне голас маладога мужчыны загадаў: «Я вам сказаў: адыдзіце ад будынка» і «Прыбярыце зброю». Ён чуў, як зламыснік загадаў усім легчы на падлогу тварам уніз, як адпраўляў кагосьці з жанчын агучыць сілавікам свае патрабаванні, як патрабаваў перамоўшчыка, а ўзамен абяцаў выпусціць жанчын. Быў момант, калі нехта з заложнікаў папрасіў дазволу выпіць лекі, потым нейкая жанчына спытала, ці патрэбны каму-небудзь валідол. «І я пачуў, як яго папрасіла мая мама — у яе слабае сэрца, ды і ўзрост ужо немалы, — перажывае мужчына. — Гэта было як страшны сон. Я не мог паверыць, што чую ўсё гэта, што гэта рэальнасць. Дзякуй богу, усё абышлося. Мама ўжо дома, але яна вельмі дрэнна сябе адчувае — ёй ужо двойчы выклікалі «хуткую». Яна прызналася, што, калі нападнік стаў пагражаць ім пісталетам, яна падумала, што жывымі адтуль ужо ніхто не выйдзе».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

**Як паведамляе БЕЛТА, па выніках праведзенай супрацоўнікамі МУС аперацыі Александрам Лукашэнкам прынята рашэнне прадставіць усіх байцоў, якія ўдзельнічалі ў затрыманні злачынца, да дзяржаўных узнагарод**





Фота прадстаўлена УУС Магілёўскага аблвыканкама.

■ Факт

## Рука дапамогі брату нашаму меншаму

**Камянецкія ратавальнікі вызвалілі з бяды сабаку. Невядома, якім чынам дварняк трапіў у раку Лясную, але самастойна выбрацца не мог. Пра гэта і паведаміў на пульт дзяжурнага МНС занепакоены гараджанін.**

Паводле слоў **афіцыйнага прадстаўніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргея МАШНОВА,** супрацоўнік райаддзела з дапамогай выратавальнай лодкі падплыў да небаракі і зацягнуў яго туды. Сабака быў такі знясілены, што яго давялося несці на руках. Пажарныя-ратавальнікі даставілі ў сваю часць чатырохногага сябра, там яго адагрэлі, накармілі. Гадзіны праз дзве дварняк адышоў, махнуў хвастом ды падаўся па сваіх сабачых справах. Магчыма, на сярэдзіну ракі жывёліна трапіла па злой волі чалавека, але, на шчасце, іншы чалавек прадэманстраваў добрую волю і паказаў прыклад паводзінаў у адносінах да братоў нашых меншых.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## Здымалі на суткі, кралі назаўсёды

**У дзяжурную частку Кастрычніцкага РУУС сталіцы паступіла заява аб кватэрным крадзяжы з жылля па вуліцы Аэрадромнай. Гаспадыня растлумачыла, што прапалі яе зберажэнні. Іх яна захоўвала ў кватэры, якую здавала на суткі. Кватэраздымшчыку жанчына дазваніцца не змагла — нумар быў недаступны.**

Праваахоўнікі ўстанавілі асобы вінаватых і пры сілавой падтрымцы байцоў СОБРа затрымалі. Гэта былі дзве дзяўчыны і хлопец. Яны здымалі кватэры на суткі на тэрыторыі сталіцы, а пасля іх ад'езду гаспадары жылля не далічваліся грошай, каштоўных рэчаў і бытавой тэхнікі. Пасля здзяйснення серыі кватэрных крадзяжоў тройка з'ехала з Мінска ў Маскву на таксі, дзе і патраціла скрадзеныя сродкі. Праз нейкі час яны вярнуліся ў Мінск, знялі на суткі прыватны дом, дзе іх і затрымалі. У гэты момант у іх быў выяўлены скрадзены тэлевізар, а таксама рэчы, набытыя на скрадзеныя грошы. Было ўстаноўлена, што затрыманыя асобы маюць дачыненне да шэрагу злачынстваў маёмаснага характару на тэрыторыі сталіцы. Ім можа пагражаць да сямі гадоў пазбаўлення волі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


**Открытое акционерное общество «Торфобрикетный завод Дитва» извещает о проведении аукциона по продаже объекта недвижимости**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| Наименование объекта, краткая характеристика | – здание пилорамы, инв. №420/С-61837, находящееся по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дитвянский с/с, агрогородок Дитва, ул. Совхозная, д. 61, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, с забором и сооружениями благоустройства. **Имеются сети электроснабжения, водопровода, канализации. Отопление автономное.** – здание склада, инв. №420/С-61838, находящееся по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дитвянский с/с, агрогородок Дитва, ул. Совхозная, д. 61/1, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. **Здания принадлежат на праве постоянного пользования ОАО «Торфобрикетный завод Дитва»** |
| Земельный участок | кадастровый номер 423683202625000024, площадью 0,6515 га. Назначение – для обслуживания здания пилорамы |
| Начальная цена продажи | 81 900 (восемьдесят одна тысяча девятьсот) белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 8 190 (восемь тысяч сто девяносто) белорусских рублей |
| Продавец | Открытое акционерное общество «Торфобрикетный завод Дитва» 231322, Гродненская область, Лидский район, пос. Дитва, ул. Первомайская, 3 |
| Организатор торгов | Открытое акционерное общество «Торфобрикетный завод Дитва» |
| Условия аукциона | Аукцион без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | BY35BLBB30120500051993001001 в ЦБУ №228 г. Лида ОАО «Белинвестбанк», SWIFT BLBBBY2X УНП 500051993, ОКПО 029990314000 |

**Аукцион состоится 27 декабря 2017 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, Лидский район, агрогородок Дитва, ул. Первомайская, 3**

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в адрес продавца подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник признается победителем торгов. Наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. Оплата приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) по цене продажи с учетом НДС в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, либо для участия в нем явился только один участник (далее – претендент на покупку), предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: Гродненская область, Лидский район, а/г Дитва, ул. Первомайская, 3 с 8.30 до 16.30.**
**Последний день приема заявлений – 26 декабря 2017 г. до 16.00**

*Телефон для справок ОАО «Торфобрикетный завод Дитва» 8-0154-577-650*



**ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 14 декабря 2017 года на 15-м открытом аукционе проводит 14-й от 9 ноября 2017 года повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 150 | Специальный автомобиль Урал-375АМ с кузовом-фургоном К1.375 в составе: Кузов-фургон К1.375 №03061 1984 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375АМ ш. 419440 дв. 117749 1984 г. *3 кат. 1 029 км* | г. Гродно в/ч 41780 | 5 500,00 | 550,00 |
| 152 | Специальный автомобиль Урал-375 с кузовом-фургоном К-375 в составе: Кузов-фургон К-375 № 05476 1987 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375 ш. 455053 дв. 852142 1987 г. *4 кат. 9 263 км* | г. Осиповичи в/ч 01313 | 5 500,00 | 550,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, **14 декабря 2017 г. в 11.00.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона (Продавцом); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона (Продавцом) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лицом – доверенность, выданная представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лицом – паспорт, представителем физ. лица – паспорт и доверенность, удостоверенная нотариально; организациями и физ. лицами (нерезидентами РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представителем юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках не подлежат разглашению.

Задаток перечисляется на р/с BY32BAPB30123268800100000000 БИК ISO BAPBBY2X ЦБУ №510 Региональная дирекция по Минской области ОАО «Белагропромбанк». Получатель – ОАО «Дорстройиндустрия», УНП 100211220, ОКПО 03455184.

Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Дорстройиндустрия» (Лот №1), проводимом 26 декабря 2017 года

Задаток, уплаченный участником, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа участника от участия в аукционе.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.00 до 12.00, с 13.00 до 17.00 по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 1-1, каб. 202. Окончание приема заявлений 19.12.2017 в 17.00.

Заключительная регистрация участников 26.12.2017 с 09.30 до 10.00 по месту проведения аукциона.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта: Потемкин Павел Сергеевич, тел. 8 (029) 389-65-43.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Организатор: 8 (017) 210-00-60, 8 (033) 660-70-50 • www.dsi.by • e-mail: jurist@dsi.by**

## Закрытое акционерное общество «Осиповичский завод транспортного машиностроения» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «ОЗТМ», проводимых на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»

| № Лота | Описание предмета электронных торгов | Начальная цена с учетом НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Лот №171117001** | Грузовой специальный самосвал CAMC HN 3250. Г. в. – 2008. Цвет – синий. Грузоподъемность 18 000 кг. Пробег – 55 660 км | 114 480,00 | 11 448,00 |
| **Лот №171117002** | Грузовой специальный самосвал IVECO LING YE. Г. в. – 2008. Цвет – бордовый. Грузоподъемность 20 000 кг. Пробег – 50 211 км | 96 480,00 | 9 648,00 |
| **Лот №171117003** | Грузовой седельный тягач CAMC HN 4250. Г. в. – 2008. Цвет – синий. Грузоподъемность 40 000 кг. Пробег – 133 151 км | 133 560,00 | 13 356,00 |
| **Лот №171117004** | Полуприцеп бортовой SZAP- 93271-01. Г. в. – 2008. Цвет – синий. Масса перевозимого груза 29 000 кг. Пробег– 133 151 км | 52 200,00 | 5 220,00 |
| **Лот №171117005** | Экскаватор «GATERPILLAR M 312». Г. в. – 2000. Цвет – желтый. Стрела – 2,50 м. Высота выгрузки – 3,15 м. Пробег – 13 999 маш/ч | 226 320,00 | 22 632,00 |
| **Лот №171117006** | Погрузчик дизельный TCM 2,5 TH. Г. в. – 2014. Цвет – светло серый. Грузоподъемность 2 500 кг. Пробег – 293 маш/ч | 41 400,00 | 4 140,00 |

**Местонахождение лотов**: РБ, Могилевская обл., г. Осиповичи, ул. Кольцевая, 1. **Шаг электронных торгов** – 5%

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) должен заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета (предметов) электронных торгов в течение 5 (пяти) рабочих дней после утверждения протокола.
2. Условия оплаты стоимости, приобретенного на электронных торгах предмета (предметов) электронных торгов – 100% предоплата.
3. Условия поставки предмета (предметов) электронных торгов: самовывоз РБ, Могилевская обл., г. Осиповичи, ул. Кольцевая 1.
4. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору стоимость затрат на организацию и проведение электронных торгов на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах электронных торгов.
5. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь и настоящим договором для Победителя электронных торгов

**Дата и время начала проведения электронных торгов – 26 декабря 2017 с 13.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»)**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом ЭТП «ТОРГИБЕЛ» с соблюдением требований Положения, утвержденного постановлением Совета Министров РБ №608 от 12 июля 2013 г.

**Продавец и организатор электронных торгов:** Закрытое акционерное общество «Осиповичский завод транспортного машиностроения», 213760, Могилевская обл., г. Осиповичи, ул. Кольцевая 1, тел. 8 (02235) 6-05-84.

**Оператор электронной торговой площадки:** РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, к. 7, тел. 8 (017) 306-00-57.

**Электронный адрес ЭТП:** http://торги.бел.

Задаток перечисляется на р/с BY68BPSB30121543370789330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в электронных торгах по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «ОЗТМ» (лот № ___), проводимых 26 декабря 2017 г. Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Аккредитация, регистрация и участие в электронных торгах осуществляется на ЭТП «ТОРГИБЕЛ».

**Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами:** 21.12.2017 в 12.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Предметами. Контактное лицо для осмотра Предметов электронных торгов – начальник БМиС Логимахов Сергей Александрович, тел. +375-44-773-89-09. Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел.)

**Организатор электронных торгов: 8 (02235) 6-05-84, 8 (02235) 6-53-46, 8 (044) 576-37-12 • www.oztm.by • e-mail: marketing@oztm.by**

**Крынічка**

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15



# ПАМЫЛКІ І НАСТУПСТВЫ

## Занадта ранняе ўкрыццё раслін на зіму

Многія дачнікі, пакідаючы ўчасткі практычна адразу пасля збору ўраджаю, імкнуцца «ўсё паспець» і, забываючы пра разумны сэнс, укрываюць расліны раней, чым ім гэта сапраўды трэба. У выніку гэтыя, здавалася б, добрыя намеры прыводзяць да развіцця захворванняў. Вільготнасць павышаецца, і ўтвараецца кандэнсат, што пры перападах тэмпературы можа быць згубным для расліны. Акрамя таго, культуры, укрытай занадта рана, горача пад сховішчам і яна не паспее «падрыхтавацца» да халадоў.

**Як трэба?** Большасць раслін трэба ўкрываць на зіму не раней, чым наступяць устойлівыя замаразкі (-5—7 °С), калі верхні пласт глебы злёгку падмерзне. Некаторыя садоўнікі забываюць пра тое, што на зіму неабходна ўцяпляць не толькі надземную частку, але і карані некаторых раслін. Для гэтага прыкаранёвую зону мульчыруюць 8—10-сантыметровым пластом пілавіння, сухой зямлёй ці торфам. Не варта ў гэтых мэтах выкарыстоўваць салому, бо ў ёй могуць уладкавацца на зімоўку грызуны. Карані касачоў і флёксаў таксама можна ўкрыць.

## Апрацоўка агарода гербіцыдамі

На першы погляд усё цалкам лагічна: ураджай сабраны, а значыць, можна апрацаваць участак гербіцыдам, каб прадухіліць рост пустазелля ў наступным сезоне. Але не ўсё так проста: большасць папулярных прэпаратаў, накіраваных на знішчэнне пустазельных траў, «не працуюць» у халоднае надвор'е, а значыць, вы дарма выдаткуеце час і сродкі.

**Як трэба?** У канцы сезона пустазелле — тое, што засталося на ўчастку — зрэжце пласкарэзам або матыкай. Глебу накрыйце нятканым матэрыялам (напрыклад, спанбондам), таксама на ўчастку можна пасеяць сідэраты. Ад пустазелля (асабліва ад макрыцы) дапамагае вапнаванне глебы. Дарэчы, восенькі перыяд як мага лепш падыходзіць для гэтай працэдуры.

## Поўная замена грунту ў цяпліцы

Непрактыкаваны дачнік можа вырашыць замяніць грунт у цяпліцы, выкапаўшы ўсю глебу, якая «стамілася» за сезон, і насыпаўшы на яе месцы свежую. Калі і вы ў ліку такіх энтузіястаў, адумайцеся! Перамясціць кудысьці не менш за 5 куб. м зямлі, знайсці такую ж колькасць добрага грунту і засыпаць назад — ці не занадта радыкальная ідэя?

**Як трэба?** Восеньская апрацоўка цяпліцы ўключае ў сябе наступныя маніпуляцыі:

- ✓ прыборка раслінных рэштkaў (яны могуць быць заражаныя, таму смецце з цяпліцы трэба спаліць);
- ✓ апырскванне градак 5%-м растворам меднага купарвасу (можна замяніць абкурваннем сернай шашкай, але толькі не ў цяпліцах з каркасам з неафарбаванага металапрофілю);
- ✓ дэзынфекцыя сцен цяпліцы растворам меднага купарвасу (80—150 г на 10 л вады);
- ✓ зняцце верхняга пласта глебы таўшчынёй 5—7 см: яго прыбіраюць у кампостную кучу, а ў цяпліцу ўносяць перагной з разліку 5—6 кг на 1 кв. м.

Перакопваючы грунт у цяпліцы восенню, не разбівайце камякі: у такім выглядзе глеба лепш прамерзне, а значыць, лічынкі шкоднікаў і іншая «зараза» загіне за зіму.

# Рэдкая расліна з чаранка

Калі ў гасцях трапіць на вочы якаянебудзь цікавая рэдкая расліна, адразу хочацца мець такую ж. Дык у чым жа справа? Папрасіце чаранок і вырасціце ў сябе такую ж прыгажосць.

Нічога складанага ў чаранкаванні няма, толькі трэба памятаць, што не кожны перыяд у развіцці раслін падыходзіць для гэтага. Напрыклад, фуксій укараняюцца практычна ў любы час, а вось герань у перыяд цвіцення карэньчыкі даваць не захоча, давядзецца чакаць, калі яна адцвіце. Ружы добра чаранкаваць з канца лета. Бальзамін хутка дасць карэньчыкі ў слоіку з вадой.

Чаранкуючы расліны, выбірайце самыя лепшыя парасткі — яны хутчэй дадуць карані.

Калі расліна пакрыта лістамі і актыўна расце, лепш за ўсё зрэзаць чаранок у той момант, калі яна максімальна напоўнена сокам, гэта значыць пасля моцнага дажджу або шчодрага паліву.

Зрэжце чаранок крыху даўжэйшы, чым вам трэба, потым вы яго акуратна падраўняеце. У чаранкоў свае асаблівасці, таму запомніце, што травяністыя, неадраўнелыя чаранкі трэба зрэзаць пры вільготным надвор'і, часткова адраўнелыя — у канцы лета, а адраўнелыя — увесну і ўвосень.

Увесну зразаюць чаранкі даўжынёй 5—10 сантыметраў з новых парасткаў у хрызантэм, вяргіняў, шалфею, дэльфініуму. У пачатку лета бяруць чаранкі даўжынёй 4—6,5 сантыметра ў дуброўкі (курыльскі чай), дэйцыі, ладанніку.



У чаранкоў выдаліце некалькі ніжніх лістоў, чаранкі апрацуйце ў гетэраўксіне або іншым даступным стымулятары кораняўтварэння. Чаранок пасадзіце ў сумесь з роўных частак торфу і пяску на глыбіню 2,5 сантыметра, шчодра паліце і накрыйце зверху поліэтыленавым пакетам. Не забывайце раз у некалькі дзён праветрываць пакет. А можна для вентыляцыі зрэзаць у пакета вуглы.

Гаршчок з чаранкамі трымайце ў светлым месцы, але не на прамых сонечных прамянях. Карані з'явяцца прыкладна праз тры тыдні. Калі чаранкі ўкараняцца, поліэтылен зніміце.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.50 | 17.01 | 8.11 |
| Віцебск — | 8.45 | 16.44 | 7.59 |
| Магілёў — | 8.40 | 16.51 | 8.11 |
| Гомель — | 8.30 | 16.54 | 8.24 |
| Гродна — | 9.04 | 17.17 | 8.13 |
| Брэст — | 8.58 | 17.25 | 8.27 |

## Месяц

*Маладзік 18 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

## Імяніны

*Пр. Матроны, Аляксандра, Аляксея, Антона, Кірыла, Парфірыя.*
*К. Цэцыліі, Маркa, Сцяпана.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 22 ЛІСТАПАДА

**1715** год — нарадзіўся Антоній Адам Скарульскі, беларускі філосаф, асветнік. Выкладаў філасофію, гісторыю і геаграфію ў езуіцкіх навучальных установах. Быў рэктарам Навагрудскага і Барскага езуіцкага калегіумаў, Віленскага шляхецкага калегіума. У 1772—1774 гадах — рэктар Віленскай акадэміі, з 1774-га — дэкан яе тэалагічнага факультэта. У 1755 выдаў у Вільні свой твор «Каментарыі па філасофіі...» У ім апісаны асноўныя філасофскія сістэмы Новага часу і адкрыцці ў прыродазнаўстве, прыведзены каштоўныя звесткі па астраноміі, механіцы і іншых абласцях ведаў. Гэты твор доўгі час лічыўся падручнікам па філасофіі. Памёр у 1777 годзе.

**1890** год — нарадзіўся Шарль Андрэ Жазэф Мары дэ Голь, французскі дзяржаўны, палітычны і ваенны дзеяч, генерал, заснавальнік і прэзідэнт Пятай Рэспублікі (1958).

**1893** год — нарадзіўся (в. Бясседавічы, цяпер у Хоцімскім раёне) Іван Захаравіч Сурта, педагог, дзяржаўны дзеяч Беларусі, акадэмік НАН Беларусі (1936 г.). У 1933—1936 гадах — наркам аховы здароўя Беларусі, у 1936—1937 гадах — прэзідэнт АН Беларусі. Аўтар навуковых прац па пытаннях метадалогіі і гісторыі прыродазнаўства. У 1937-м быў арыштаваны і прысуджаны да выключнай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1956-м.

**1925** год — нарадзіўся (в. Магільнае, цяпер у Столінскім раёне) Мікалай Сяргеевіч Каральчук, удзельнік барацьбы за ўмацаванне савецкай улады ў заходніх абласцях Беларусі. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў у партызанскім атрадзе, затым — у Чырвонай Арміі, наводчык у мінамётным палку, дайшоў да Берліна. У 1948 годзе вярнуўся на радзіму, адзін з арганізатараў і член праўлення калгаса «Чырвоны партызан» у вёсцы Магільнае. Забіты ў 1949 годзе.



**1960** год — з канвеера запарожскага завода «Камунар» (які пазней быў перайменаваны ў «Запарожскі аўтамабілебудаўнічы завод») сышла першая прамысловая партыя аўтамабіляў «Запарожац» — ЗАЗ-965. Узорам для гэтага «народнага» аўтамабіля паслужыў італьянскі FIAT 600. Даволі хутка савецкі «народны» аўтамабіль набыў славу непераборлівага і рамонтапрыдатнага, што было вельмі важна. Дарэчы, вядома гэтая машына была не толькі ў СССР, але і за мяжой, дзе яна прадавалася пад брэндам «Yalta». На гэтай жа базе завод стаў выпускаць і так званыя інвалідкі — мадыфікацыю ЗАЗ са зменнымі механізмамі кіравання. «Гарбаты» «Запарожац» выпускаўся ў першапачатковым выглядзе аж да 1962 года, а далей гэтая машына была мадыфікаваная ў іншыя мадэльныя рады.

### Было сказана

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, паэт, празаік, публіцыст:**

*«А нам стаяць, не гнуцца, як трысцё,*
*Бо лёс славян і лёс майго народа —*
*Нялёгкае і гордае жыццё».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Дыялогі ў сеціве.**
**— Парайце яд для мышэй, які не нашкодзіць сабакам.**
**— Кошка.**

Ідэальныя адносіны з пунктугледжання дзяўчыны — гэта калі ты купляеш яму зубную шчотку, а ён табе — машыну.

**Пераломныя моманты ў адносінах:**
**— першая сустрэча,**
**— першы пацалунак,**
**— першы секс,**
**— «Мая мама перадала табе грыбы і сала».**

Венера — адзіная планета ў нашай сістэме, якая круціцца супраць гадзіннікавай стрэлкі.
Адразу відаць — БАБА!

**— А ты ведаеш, хто першым паляцеў у космас на сабаках?**
**— Чукчы?**
**— Блохі!**



Малюнак Вікенція ПУЗАНКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4366.
Нумар падпісаны ў 19.30 21 лістапада 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

22 лістапада 2017 г. №44 (428)




стар. 3

Ці лёгка быць дэпутатам?



стар. 6

Як падоўжыць каровін «век»



стар. 7

Калі плаціш... за паветра

ТЭМА ТЫДНЯ

# БУДУЧЫНЯ ПАЧЫНАЕЦЦА СЁННЯ

## Як найбліжэйшая пяцігодка зменіць сельскагаспадарчую галіну



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**СЕЛЬСКАЯ гаспадарка для Беларусі — адна з найбольш важных даходных пазіцый для бюджэту. Пад брэндам «зроблена ў Беларусі» выпрабляюцца разнастайныя малочныя і мясныя вырабы, якія асацыююцца ў спажыўцоў з высокай якасцю. Таксама ў СНД пастаўляецца самая свежая агародніна і садавіна. У краіне практычна цалкам замяшчаецца імпарт, а таксама штогод павялічваюцца экспартныя паказчыкі. Толькі сёлета, паводле інфармацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, экспарт галіны ў перыяд са студзеня па жнівень дасягнуў узроўню 1,64 млрд долараў — 112,1% да адпаведнага ўзроўню 2016 года. Сёння стаіць задача нарасціць экспарт прадукцыі не менш, чым на 11,5%. Праца над пастаўкамі, нарошчванне аб'ёмаў выпрабленай прадукцыі патрабуюць асаблівай увагі да мадэрнізацыі і інавацый.**

стар. 4

У АБАРОНУ «ЗЯЛЁНАГА»

# ССЕКЧЫ АБО ПАМІЛАВАЦЬ?

## Што адбываецца з раслінным светам сталіцы

**Гэтай восенню ўступіла ў сілу рашэнне надаць васьмі батанічным аб'ектам у Мінску статус помніка прыроды мясцовага значэння. Для сталіцы гэта першы выпадак — разгляд пытання доўжыўся тры гады. Тым не менш апошнім часам у зводках навін часцей трапляюцца паведамленні пра тое, што ў тым ці іншым месцы дрэвы не абараняюць, а, наадварот, пазбаўляюцца ад іх. Мясцовыя жыхары пішуць скаргі ў адміністрацыі, а сацыяльныя сеткі стракацяць фотаздымкамі на фоне ссечаных дрэў з настальгічнымі подпісамі: «На гэтых галінах я правеў палову свайго шчаслівага дзяцінства...»**

### За ўсім — чалавечы фактар

Па звычцы ва ўсіх бедах шмат хто вінаваціць «Мінскзялёнбуд». Але, па-першае, варта заўважыць, што гэтая арганізацыя адказвае толькі за ўтрыманне насаджэнняў паблізу дарог, у скверах і парках. Да ўсяго, што адбываецца ў дварах жылых дамоў, яна дачынення не мае. Па-другое, менавіта за ўтрыманне. Складанне планаў пасадак — задача іншых устаноў. Атрымліваецца так: адны садзяць, іншыя камандуюць як, а трэція кантралююць. Натуральна, не абыходзіцца без блытаніны. Так што частка прэтэнзій у бок работнікаў прадпрыемства адрасуецца несправядліва, аднак ёсць заўвагі і па справе.



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

— Прычын таго, што сталічныя дрэвы знаходзяцца не ў лепшым стане, шмат: гэта і недастатковы маніторынг, і вялікая колькасць пашкоджанняў, зробленых транспартнымі сродкамі. Другі пункт — вынік нізкага ўзроўню працоўнай дысцыпліны і прафесіяналізму супрацоўнікаў як «Мінскзялёнбуда», так і ЖКГ. Яны дазваляюць сабе, нягледзячы на забароны, выязджаць на газоны з мяккай глебай на цяжкай тэхніцы — маўляў, далёка цягнуць ссечаныя галіны да асфальту. У выніку пашкоджваецца каранёвая сістэма дрэў. На мой погляд, гэта службовае парушэнне, за якім павінна ісці сур'ёзнае пакаранне. Зразумела, гэта толькі адна з прычын праблемы, але досыць істотная, — разважае **актывіст грамадскай кампаніі «Гарадскі ляснічы» Ігар КОРЗУН**.

стар. 7

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## НАВУКА Ў ПАДТРЫМКУ ЭКАНОМІКІ

*Міхаіл МЯСНІКОВІЧ паўдзельнічаў у выбарах акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў НАН*



**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, прафесар Міхаіл Мясніковіч узяў удзел у сесіі Агульнага сходу НАН, прысвечанай выбарам акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў. Гэта падзея — адна з ключавых у Год навукі.**

«Я ўважліва вывучыў кандыдатуры, і мяне радуе, што многія з іх сапраўды стварылі добрыя навуковыя школы ў перспектыўных галінах, унеслі ўклад у падтрымку рэальнага сектара эканомікі, развіццё навуковай сферы. Мне ўяўляюцца асабліва перспектыўнымі пытанні, звязаныя з біятэхналогіямі, медыцынай, асабліва з высокімі тэхналогіямі ў медыцыне. Цяпер для нас асабліва актуальная хімія палімераў, бо мы перапрацоўваем вялікія аб'ёмы нафты, а нашай хімічнай прамысловасці для вытворчасці хімвалокнаў патрэбныя араматычныя вуглевадароды ў якасці сыравіны», — такое меркаванне выказаў парламентарый.

## ПЯЦІГОДКА ПРАЙШЛА АМАЛЬ НАПАЛОВУ

*Спікер верхняй палаты аб эканамічных кірунках развіцця краіны*

**Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч правёў пашыранае пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі. Падчас яго былі разгледжаны праекты прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця, бюджэту і асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі на 2018 год.**

Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што названыя дакументы ахопліваюць трэці год бягучай пяцігодкі. Важна разглядаць іх у пакеце з улікам задач, якія трэба будзе вырашыць у 2019—2020 гадах. «Трэба звярнуць асаблівую ўвагу, наколькі ўсе гэтыя працэсы гарманізаваны ў рамках ЕАЭС, Саюзнай дзяржавы, наколькі ўлічаны знешнія фактары — кошты на энерганосьбіты, умовы гандлю і іншыя важныя пытанні», — падкрэсліў ён.

На пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі было адзначана, што паскарэнне росту колькасці занятых у эканоміцы павінна стаць мэтавай задачай на наступны год для ўсёй вертыкалі ўлады, а паказчык занятых у эканоміцы — увайсці ў пералік найважнейшых паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Удзельнікі пасяджэння таксама звярнулі ўвагу на важнасць мер па павышэнні навукаёмістасці ВУП, фарміраванні разгорнутых мэтавых задач навукова-тэхнічнага развіцця.

Па выніках пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі спікер звярнуў увагу на некалькі пытанняў, у тым ліку на забеспячэнне канкурэнтаздольнасці беларускіх вытворчасцяў. «Наша прамысловасць, сельская гаспадарка, энергетыка павінны вырабляць высокаліквідны тавар, які будзе затрабаваным на знешніх рынках. Пры гэтым трэба разумець, што мы вырабляем тавары, якіх у свеце перавытворчасць», — падкрэсліў ён. Неабходна вытрымліваць высокую канкурэнцыю, а для гэтага трэба ўкладаць грошы ў далейшае развіццё. З улікам нарастаючай канкурэнцыі і навукова-тэхнічнага прагрэсу мэтазгодна перагледзець падыходы па развіцці рэальнага сектара эканомікі. Важна таксама ўдакладніць прыярытэты навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, ацаніць эфектыўнасць работы інавацыйных фондаў. Старшыня Савета Рэспублікі падтрымаў ідэю аб больш шырокім удзеле камерцыйных банкаў у рэалізацыі перспектыўных інвестыцыйных праектаў.

## АДНАВІЛІ «АРТЭРЫЮ»

*Сенатар дапамог жыхарам вёсак вырашыць пытанне з рамонтам дарогі*

**Да члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Алега Суконкі паступіў зварот ад жыхароў вёсак Вярбіцкія і Чарцяж, што ў Мінскім раёне, а таксама ад членаў садовых таварыстваў «Бярозавы гай-1», «Пралеска-10», «Сонечная паляна» і кааператыва індывідуальных забудоўшчыкаў «Чарцяж». Зварот датычыцца рамонту і добраўпарадкавання аўтадарогі Н-9066 Бараўляны — Вярбіцкія — Чарцяж, якая знаходзілася ў дрэнным стане.**

Па пытанні правядзення дарогі ў парадак жыхары даўно звярталіся ў розныя інстанцыі, бо гэты шлях з'яўляецца асноўнай артэрыяй, якая злучае перапічаныя населеныя пункты з аб'ектамі сацыяльнага і бытавога прызначэння. Зварот быў разгледжаны ва ўзаемадзеянні са службовымі асобамі дзяржаўных органаў і органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання з выездам на месца. Парламентарый унёс свае прапановы па рашэнні праблемнай сітуацыі. Вынікам правядзенай работы стаў якасны рамонт дарогі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

ВЫБАРЫ-2018

# НАЙЛЕПШЫ СПОСАБ — ЗБІРАЦЬ ПОДПІСЫ

### Больш падрабязна аб тым, як правільна запаўняць падпісныя лісты

**На мінулым тыдні адбылося пасяджэнне Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў. Падчас яго абмяркоўваўся не толькі каляндарны план выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў, але і іх бюджэт, быў таксама зацверджаны метадалагічны дапаможнік.**



Фота БЕЛТА.

Падчас пасяджэння была агучана думка пра тое, што найбольш эфектыўным спосабам вылучэння кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў застаецца збор подпісаў. Так лічыць Галіна Мкртычан, загадчык аддзела прававой, аналітычнай і метадычнай работы ЦВК. На яе думку, у гэтым працэсе адначасова прысутнічае элемент перадвыбарчай агітацыі за кандыдата. Тым не менш пры вылучэнні менавіта такім спосабам, як правіла, допускаецца вялікая колькасць памылак.

> Адзін чалавек можа паставіць подпіс за вылучэнне некалькіх кандыдатаў у дэпутаты ў сваёй акрузе.

Галіна Мкртычан нагадала, што збор подпісаў можа ажыццяўляцца толькі членамі ініцыятыўных груп, якія павінны абавязкова мець пры сабе пасведчанне, выдадзенае адпаведнай выбарчай камісіяй, і дакумент, які пацвярджае іх асобу. У падтрымку асоб, прапанаваных да вылучэння кандыдатамі ў дэпутаты, выбаршчыкі ставяць подпісы ў падпісных лістах, якія выраблены Цэнтрвыбаркамам ва ўсталяванай форме. Але пры неабходнасці допускаецца і ксеракапіраванне бланкаў альбо раздрукоўка іх з сайта ЦВК. Пры гэтым павінны захоўвацца форма і памер падпіснога ліста.

Законам прадугледжаны патрабаванні да запаўнення падпісных лістоў. Перш за ўсё, у кожны падпісны ліст яшчэ да пачатку збору подпісаў павінны быць унесены без скарачэнняў звесткі аб асобах, якія вылучаюцца кандыдатамі: прозвішча, імя, дата нараджэння, месца працы альбо занятак, пасада, якую займае, месца жыхарства, партыйнасць. Збор подпісаў у лістах, у якіх гэтыя звесткі адсутнічаюць, не допускаецца. Невыкананне патрабавання пацягне прававыя наступствы (да адміністрацыйнай адказнасці).

Ставіць у падпісных лістах свае подпісы ў падтрымку кандыдата маюць права грамадзяне Беларусі, якія дасягнулі 18 гадоў, а таксама грамадзяне Расіі, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Беларусі і маюць від на жыхарства. У падпісным лісце павінны быць подпісы толькі тых выбаршчыкаў, якія пражываюць на тэрыторыі акругі, па якой вылучаецца кандыдат. Подпісы, сабраныя на тэрыторыі іншай акругі, улічвацца не будуць. Але пры гэтым адзін чалавек можа паставіць подпіс за вылучэнне некалькіх кандыдатаў у дэпутаты ў сваёй акрузе. Таксама важна памятаць, што нельга карыстацца алоўкам пры запаўненні ліста.

Нагадаем, што ў мясцовыя Саветы дэпутатаў плануецца абраць больш за 18 тысяч дэпутатаў. Адпаведна, будзе ўтворана аналагічная колькасць выбарчых акруг. Выбарная кампанія павінна пачацца за тры месяцы да асноўнага дня галасавання — 18 лютага, гэта значыць не пазней за 18 лістапада. Вылучэнне кандыдатаў праводзіцца традыцыйнымі спосабамі: ад палітычных партый, ад працоўных калектываў і ад грамадзян шляхам збору подпісаў.

Згодна з заканадаўствам на выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў няма парога яўкі, таму перамагае кандыдат, які набраў большасць галасоў. Замежныя назіральнікі для маніторынгу не запрашаюцца (выключэнне можа рабіцца для прадстаўнікоў акрэдытаванага дыпкорпуса). Але ў маніторынгу могуць браць удзел нацыянальныя назіральнікі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# Самыя неабыякавыя

### Саюзная дзяржава робіць стаўку на моладзь

**У Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі будзе створана Маладзёжная палата. Каардынацыю яе дзейнасці плануецца ўскласці на Камісію Парламенцкага сходу па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях і Камісію Парламенцкага сходу па заканадаўстве і рэгламенце.**

Паводле слоў **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра ПАПКОВА,** зараз у камісіях Парламенцкага сходу ідуць актыўныя абмеркаванні ўсіх пытанняў, звязаных са стварэннем Маладзёжнага парламента. Галоўная мэта гэтага кроку — уключэнне моладзі ў працэс будаўніцтва Саюзнай дзяржавы і далучэнне маладых людзей з актыўнай жыццёвай пазіцыяй з Беларусі і Расіі да парламенцкай дзейнасці: «Моладзь — самая неабыякавая частка грамадства, і праводзіць маладзёжную палітыку, адстойваць інтарэсы сваіх аднагодак павінны маладыя людзі».

На думку парламентарыя, таксама важным з'яўляецца пытанне каардынацыі ўзаемадзеяння маладзёжных арганізацый абедзвюх краін.

Плануецца, што ў склад Маладзёжнай палаты ўвойдуць 40 чалавек ва ўзросце ад 18 да 35 гадоў, з якіх 20 грамадзян Рэспублікі Беларусь і 20 — Расійскай Федэрацыі.

Вызначаць парадак дэлегавання прадстаўнікоў у склад Маладзёжнай палаты, іх адкліканне, а таксама тэрмін іх паўнамоцтваў у Маладзёжнай палаце будуць палаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі.

У рабоце Маладзёжнай палаты будуць прымаць удзел і дэпутаты Парламенцкага сходу, службовыя асобы Сакратарыята Парламенцкага сходу і Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы. Старшыні Маладзёжнай палаты дадуць права голасу на пасяджэннях сесій Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па пытаннях, якія закранаюць інтарэсы моладзі. Таксама мяркуецца ўдзел маладых парламентарыяў у парламенцкіх слуханнях, канферэнцыях, семінарах і іншых мерапрыемствах Парламенцкага сходу і Саюзнай дзяржавы.

Канчатковае рашэнне аб стварэнні Маладзёжнай палаты Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі будуць прымаць дэпутаты Саюзнага парламента на сваім чарговым пасяджэнні ў Бранску, якое запланавана на сярэдзіну снежня.

**Наталля БІТЭЛЬ.**

## АБМЯРКУЕМ РАЗАМ!

**У снежні журналісты «МС» плануюць арганізаваць круглы стол, каб высветліць, наколькі эфектыўна працуюць дэпутаты сельскіх Саветаў на месцах і што ім дапамагае (перашкаджае) гэта рабіць. Калі ў вас ёсць праблема, якая не вырашаецца, ці гісторыя пра ваш зварот (выніковы ці безвыніковы) да мясцовых уладаў, напішыце нам пра гэта. Мы пастараемся высветліць, у чым справа.**

**На круглы стол будуць запрошаны дэпутаты розных узроўняў. Калі ў вас ёсць да іх пытанні, паведаміце нам. Найбольш цікавыя будуць агучаны, а адказы надрукаваны ў газеце. Пісьмы прымаюцца па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, з паметкай «Звязда», па электроннай пошце zvarot@zviazda.by ці па тэлефоне +375 (17) 287 17 21.**

**«МС»**

ШТО МОЖА ДЭПУТАТ

# ВАЖНА ЎЛІЧВАЦЬ МЕРКАВАННІ ЛЮДЗЕЙ

**УСЯ дзейнасць дэпутацкага корпуса сёння цесна звязана з выканаўчымі органамі ўлады ўсіх узроўняў. Да вырашэння пытанняў грамадзян прыцягваюцца арганізацыі камунальнага і сацыяльнага прызначэння. Але ж яшчэ вельмі важна мець сістэму грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання непасрэдна з удзелам жыхароў, лічыць старшыня Жлобінскага раённага Савета дэпутатаў Міхаіл КАСЮКОЎ.**



Старшыня Жлобінскага раённага Савета дэпутатаў Міхаіл КАСЮКОЎ, сакратар адміністрацыйнай тэрытарыяльнай акругі №3 г. Жлобіна Алена СТАРЫНСКАЯ і дэпутат райсавета па Жамчужнай выбарчай акрузе №29 Ігар АЛЯКСЕЕНКА.

— Побач з традыцыйнымі формамі супрацоўніцтва з выканаўчай уладай у рашэнні розных пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна, такімі як сесіі, сумесныя пасяджэнні, інфармацыйна-прапагандысцкія групы і іншыя, у нас існуе практыка рэалізацыі наказаў людзей, якія паступілі падчас выбарчай кампаніі. Адпаведны дакумент пасля кожнай выбарчай кампаніі разглядаецца на сумесным пасяджэнні прэзідыума райсавета і райвыканкама. Звычайна ў ім каля 80—100 пытанняў. У залежнасці ад складанасці і магчымасці фінансавання выкананне мерапрыемстваў уключаецца ў праграму адпаведных арганізацый, разбіваецца на чатыры гады і з'яўляецца абавязковым. Вось ужо чатыры скліканні такая сістэма дзейнічае ў раёне.

**— І для чаго гэта робіцца?**

— Усё адно з гэтымі пытаннямі людзі хадзілі б па інстанцыях і дэпутаты таксама рабілі б пісьмовыя запыты, таму наш падыход дапамагае паменшыць бюракратызм. Да таго ж грамадзяне бачаць рэальную праграму дэпутата, і самае важнае, што да іх запытаў мясцовая ўлада ставіцца з павагай. Другі кірунак — пастаянны ўдзел дэпутатаў у дзейнасці працоўных калектываў канкрэтнай акругі. Ад эфектыўнай і зладжанай працы прадпрыемстваў залежыць дабрабыт людзей і развіццё адпаведнай тэрыторыі. Не менш важная і работа з насельніцтвам па месцы жыхарства. Формы тут розныя: прыёмы па асабістых пытаннях, дэпутацкія пасты і дэпутацкія групы, маніторынгавыя групы, арганізацыя суботнікаў па добраўпарадкаванні, удзел у сходах, культурна-спартыўных мерапрыемствах і г. д. Але самае дзейснае, на мой погляд, — гэта ўдзел у рабоце органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Як у сельскай, так і ў гарадской мясцовасці.

**— Як выглядае сістэма грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання ў Жлобінскім раёне?**

— У сельскіх населеных пунктах Жлобінскага раёна абрана 84 старэйшыны. У горадзе — 20 старэйшын кварталаў індывідуальнай забудовы. У шматпавярховых дамах самакіраванне прадстаўляюць старшыя па доме (у дамах камунальнай уласнасці) — іх 172 чалавекі, і старшыні жыллёва-будаўнічых вытворчых кааператываў — іх 96. Для каардынацыі дзейнасці гэтай даволі значнай групы грамадскіх прадстаўнікоў, правядзення неабходнай арганізатарскай работы сярод жыхароў у горадзе ў межах ЖЭУ дзейнічае шэсць Саветаў самакіравання. Адным з кірункаў дзейнасці раённага Савета з'яўляецца яго ўзаемадзеянне з Саветам пярвічнага ўзроўню. У плоскасці сумеснай работы — пытанні назіральных камісій, сходы грамадзян, правядзенне свят, прысвечаных Дню вёскі, правядзенне Дзён дэпутата і Дзён выканкама і г. д.

**— Сур'ёзныя праблемы часам дадаюць грамадзяне, якія вядуць асацыяльны лад жыцця. Як дэпутаты мясцовых Саветаў могуць паўплываць на іх?**

— Вось ужо некалькі гадоў у раёне існуе практыка выезду ў сельсаветы камісіі па прафілактыцы правапарушэнняў і непрацуючых асоб, створанай пры райвыканкаме. У склад камісіі ўваходзяць кіраўнікі праваахоўных органаў раёна, работнікі райвыканкама, дэпутаты райсавета. За 2016 год і 10 месяцаў 2017-га прайшло 26 пасяджэнняў камісіі. Разгледжана 222 чалавекі, якія вядуць асацыяльны лад жыцця. 50 працаўладкаваны, 13 адпраўлены ў ЛПП. Такая работа дазваляе выявіць на месцы негатыўныя тэндэнцыі, а таксама паўплываць на людзей, якія знаходзяцца ў групе рызыкі.

**— Міхаіл Васілевіч, ці ёсць нейкія асаблівасці правядзення на Жлобіншчыне Дзён Саветаў?**

— Гэта традыцыйная форма, якая распаўсюджана ў краіне. Мы на Жлобіншчыне яе ўвесь час удасканальвалі. У мэтах павышэння аддачы Дні Саветаў і Дні ЖЭУ плануюцца загадзя, напярэдадні новага фінансавага года. Каб спланаваць сродкі на прывядзенне ў парадак вытворчых, сацыяльна-культурных, камунальных і бытавых аб'ектаў. Такая канцэнтрацыя сродкаў дае станоўчыя вынікі.

**— Раскажыце, калі ласка, пра работу па навядзенні парадку на зямлі.**

— Толькі за апошнія пяць гадоў у сельскіх населеных пунктах Жлобінскага раёна знесена амаль тысяча трухлявых дамоў, у гаспадарчы абарот перададзена 750 га былых прысядзібных участкаў. Саветы дапамагаюць у рабоце па ўцягванні ў гаспадарчы абарот маёмасці дзяржаўнай уласнасці, якая не выкарыстоўваецца. З мэтай падтрымкі прадпрымальніцкай ініцыятывы пры продажы дзяржаўнай маёмасці ў раёне прадугледжаны шэраг ільгот, прынятых у тым ліку пры ўдзеле раённага Савета дэпутатаў. Прадугледжана растэрміноўка аплаты за набытую нерухомую маёмасць тэрмінам да года ў Жлобіне і да пяці гадоў — у сельскай мясцовасці, а таксама растэрміноўка арандатарам, якія выкупляюць маёмасць па заканчэнні тэрміну арэнды — ад трох да пяці гадоў. Прэзідыум падтрымаў наступную прапанову райвыканкама: суб'екты гаспадарання ў выпадку арганізацыі на набытых аб'ектах не менш як трох працоўных месцаў вызваляюцца ад павышальнага каэфіцыента ў 2,5 раза пры разліку арэнднай платы за зямельныя ўчасткі на працягу трох гадоў — калі штогод прадугледжана далейшае павелічэнне колькасці працоўных.

**— Вядома, асноўным кірункам работы дэпутацкага корпуса з'яўляецца пастаянная сувязь са сваімі выбаршчыкамі...**

— Толькі сёлета дэпутатамі абласнога і раённага Саветаў на Жлобіншчыне праведзена 375 прыёмаў і сустрэч у працоўных калектывах і па месцы жыхарства. Раз на паўгоддзе, а часам і на квартал, пад кіраўніцтвам раённага Савета дэпутатаў і раённага выканаўчага камітэта праводзіцца інфармацыйна-навучальная нарада прадстаўнікоў органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання з запрашэннем усіх суб'ектаў гаспадарання. Такім чынам мы імкнёмся выпрацаваць новыя падыходы да рашэння пытанняў, якія хвалююць нашых людзей. Акрамя гэтага, арганізоўваюцца сустрэчы-сходы дэпутатаў усіх узроўняў і прадстаўнікоў выканаўчай улады з жыхарамі горада. Сёлета прайшло шэсць такіх сустрэч. У аснове рашэнняў выканаўчай улады заўсёды прысутнічае ўстаноўка: улічваць меркаванне людзей. Рашэнні па ўсіх складаных пытаннях на вёсцы — такіх, як закрыццё ці вызначэнне рэжыму працы крамы, ФАПаў, пошты, разліковых цэнтраў, маршрутаў аўтобусаў — прымаюцца пасля абмеркавання на сесіях сельскіх Саветаў. Такую ж практыку мы імкнёмся перанесці і на горад. Тут у ролі экспертаў выступаюць Саветы грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

НА СУВЯЗІ

# ГРОШЫ ЗА ПАСЛУГУ, ЯКОЙ НЕ ІСНУЕ

**У Мінаблвыканкаме прайшла прамая тэлефонная лінія. Званкі прымаў старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Іван ЛІПНІЦКІ. На гэты раз найбольш зваротаў было з Пухавіцкага, Барысаўскага, Маладзечанскага і Салігорскага раёнаў.**

Як заўсёды, не абышлося без пытанняў узаемаадносін з суседзямі, якія можна было б вырашыць без пасярэднікаў. Так бы мовіць, сесці радком ды паталкаваць ладком. Жанчына адной з вёсак, што на Пухаўшчыне, паскардзілася, што суседзі пасадзілі каля плоту тры туі, якія ёй перашкаджаюць. Дрэўцы ўжо выраслі да 70 сантыметраў. «Але ж гэта яшчэ не мяжа, з цягам часу вымахаюць больш за метр», — уздыхала заяўніца. З гэтым пытаннем яна звярталася ў мясцовы сельвыканкам, які даў прадпісанне перасадзіць расліны ў іншае месца. Ды яго гаспадары не выканалі — паколькі дрэўцы высаджаны тры гады таму, то і тэрмін даўнасці выйшаў.

Іван Ліпніцкі параіў пагутарыць з суседзямі па душах, прыслухацца да іх пункту гледжання. Яшчэ адзін варыянт — звярнуцца ў суд.

Марыя Міхайлаўна з Рудзенска прасіла пасадзейнічаць у навядзенні парадку ў пасёлку. Маўляў, вечарам не гарыць вулічнае асвятленне, недастаткова кантэйнераў для смецця, дрэнна працуе грамадскі транспарт. Яе зямлячка Людміла Уладзіміраўна паскардзілася, што на прыпынку паблізу дома адсутнічае расклад руху аўтобусаў, таму яны праходзяць міма. Іван Ліпніцкі даручыў зрабіць запыт у адпаведныя службы і даць адказ.



Фота БЕЛТА.

З Барысава патэлефанавала Лідзія Мікалаеўна. Яна расказала, што жыльцам іх дома ў «жыроўках» налічваюць грошы за карыстанне калектыўнай антэнай. Усе абураны такім фактам, паколькі ў кожнай кватэры падключана кабельнае тэлебачанне.

Ніна Васілеўна, таксама з Барысава, прасіла пасадзейнічаць у завяршэнні ўцяплення дома. Рамонтнікі выканалі толькі палову работ. Але па акце прыёмкі нібыта ўсё зроблена. Іван Эдуардавіч даручыў разабрацца ў сітуацыі спецыялістам. І калі гэта сапраўды так, вінаватых прыцягнуць да адказнасці.

**Андрэй Міхайлавіч з пасёлка Зембін Барысаўскага раёна хоча ўзяць у арэнду памяшканне пад магазін. Пасля звароту да абласных улад яму абяцалі выдзеліць плошчы. Аднак аддалі іх іншаму чалавеку. Іван Ліпніцкі запэўніў, што ў найбліжэйшы час наведаецца ў Барысаў, а пытанне ён бярэ пад асабісты кантроль.**

Вольга Мікалаеўна з вёскі Турэц-Бяры Маладзечанскага раёна ў адпачынку па доглядзе малога. Жанчына абураецца, што вада ў кране не адпавядае неабходнай тэмпературы — ледзьве цёплая, па начах ацяпленне адключаюць, на вуліцы няма святла. У Маладзечанскі райвыканкам адрасавана пісьмо з просьбай разабрацца ў сітуацыі.

Жыхар Маладзечна Віктар Тадэвушавіч чатыры гады працаваў на прыватным прадпрыемстве, якое потым ліквідавалі. Мужчыну хвалюе, што за гэты перыяд ён не атрымае пенсіі, паколькі структура не адлічвала ўзносы ў сацыяльны фонд. Іван Ліпніцкі накіраваў зварот старшыні Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Мінаблвыканкама Алегу Семенчуку з просьбай разабрацца і даць адказ.

Незвычайны званок паступіў з Салігорскага раёна. Ніна Вітольдаўна ледзьве не плакала ў трубку: мужа адмовіліся пакласці ў бальніцу. Тлумачаць адмову тым, што для шпіталізацыі няма паказанняў, і перанакіроўваюць у наркалагічны дыспансер, але там няма месцаў. А ён вельмі дрэнна сябе адчувае. «Падумаеш, выпіў кроплю! Іншых п'яніц нават з-пад плоту забіраюць у медыцынскія ўстановы», — абураецца жанчына. Цяжка сказаць, колькі кропляў прыняў на грудзі гаспадар. Але Эдуард Ліпніцкі ўсё ж патэлефанаваў, каб на названы адрас выслалі хуткую дапамогу.

Шматлікія звароты будуць сістэматызаваны і дэталёва вывучаны. А заяўнікі атрымаюць адказы на працягу месяца.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

# БУДУЧЫНЯ ПАЧЫНАЕЦЦА СЁННЯ...



Фота БЕЛТА.

## ПАВЫШАЕМ УРАДЖАЙНАСЦЬ

**Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід ЗАЯЦ** адзначае, што ў гэтай пяцігодцы развіццё аграпрамысловага комплексу забяспечваецца ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай развіцця аграрнага бізнесу на 2016—2020 гады. У рамках дзяржпраграмы ажыццяўляецца рэалізацыя 11 падпраграм, якія прадугледжваюць развіццё вытворчасці і рэалізацыі расліннаводчай і жывёлагадоўчай прадукцыі, а таксама селекцыі і насенняводства, племянной справы ў жывёлагадоўлі. Таксама запланавана падтрымка малых формаў гаспадарання, тэхнічная і тэхналагічная мадэрнізацыя, развіццё меліярацыі сельскагаспадарчых земляў.

У раслінаводстве прадугледжваецца пільна сачыць за павышэннем глебавай урадлівасці. Таксама ідзе работа па дасягненні максімальнай акупнасці ўраджаю. Для галіны стратэгічна важна забяспечыць і пагалоўе буйной рагатай жывёлы высокаэнергетычнымі, збалансаванымі кармамі.

**У выніку да канца 2020 года плануецца павысіць ураджайнасць збожжавых культур на 9% да ўзроўню 2015 года, бульбы — на 25%, агародніны — на 9%, пладоў і ягад — у 2,5 раза, рапсу — на 31%, цукровых буракоў — на 51%. Акрамя таго, павялічыць вытворчасць прадукцыі раслінаводства ў гаспадарках усіх катэгорый на 9,3% да ўзроўню 2015 года.**

Зараз у краіне таксама працуюць над пытаннем укаранення прынцыпаў арганічнага земляробства. Дарэчы, адпаведны закон плануецца ўнесці ў парламент да канца года. Згодна з ім дзяржава будзе аказваць падтрымку тым суб'ектам гаспадарання, якія накіраваны на развіццё такога віду земляробства. Леанід Заяц лічыць, што земляробства ў Беларусі павінна быць экалагічна інтэнсіўнае, гарантаваць харчовую бяспеку, і ахову навакольнага асяроддзя. Для гэтага і патрэбны адпаведны дакумент, у якім будзе вызначана паняцце арганічнай вытворчасці, а таксама агульныя патрабаванні да вытворчасці і абарачэння арганічнай прадукцыі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

## РОБАТЫ І КАРОВЫ

Для жывёлагадоўлі на перыяд дзеяння праграмы па аграрным бізнесе таксама вызначаны прыярытэтныя напрамкі. Плануецца шырокае ўкараненне рэсурсазберагальных тэхналогій, якія пазітыўна паўплываюць на вытворчасць прадукцыі за кошт скарачэння матэрыяльных і працоўных выдаткаў, і, як вынік — на зніжэнне сабекошту. Плануецца павышэнне ўзроўню аховы краіны — а менавіта ў плане біялагічнай бяспекі сельскагаспадарчых жывёл, экалогіі навакольнага асяроддзя, бяспекі прадуктаў харчавання насельніцтва. Планы напалеонаўскія. У выніку да 2020 года вытворчасць прадукцыі жывёлагадоўлі ў гаспадарках усіх катэгорый будзе павялічана на 18,3% да ўзроўню 2015 года. Запланаваныя аб'ёмы вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі дадуць магчымасць да 2020 года цалкам забяспечыць патрэбы ўнутранага рынку ў асноўных відах плодаагародніннай, мяса-малочнай прадукцыі, хлебабулачных, мукамольна-крупяных вырабаў.

Станоўчыя тэндэнцыі можна адчуць ужо і ў гэтым годзе. «Па выніках працы за дзесяць месяцаў у аграпрамысловым комплексе назіраецца станоўчая дынаміка развіцця. Тэмп росту вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі ва ўсіх катэгорыях склаў 102,9%, у сельгасарганізацыях — 103,8%. Па выніках года мы забяспечым рост вытворчасці сельгаспрадукцыі на ўзроўні 3%», — сказаў Леанід Заяц. Міністр звярнуў увагу на тое, што ў краіне ёсць значныя рэзервы для павышэння эканамічнай эфектыўнасці сельскай гаспадаркі. «У прыярытэце завяршыць будаўніцтва свінатаварных комплексаў у Гродзенскай, Магілёўскай, Віцебскай, Мінскай абласцях. Акрамя таго, у ступені гатоўнасці 50% і вышэй знаходзяцца 128 малочнатаварных фермаў», — падкрэсліў ён.

Генетыка малочнай жывёлагадоўлі краіны сёння на высокім узроўні. Важная задача — раскрыць увесь яе патэнцыял. «Сёння і займаюцца нашы навукоўцы. Мы паляпшаем пародны патэнцыял. У нас ёсць элітнае ядро кароў, якія размешчаны ў найлепшых гаспадарках. Створана піраміда племянной справы. Там мы хутка сканцэнтруем найлепшы сусветны генетычны патэнцыял. Кожны год племяннае ядро будзе толькі пашырацца», — растлумачыў міністр.

Таксама, па яго словах, будзе пашырацца і тэхнічны патэнцыял для жывёлагадоўлі. У Беларусі ёсць сучасныя даільныя залы і тэхналогіі. Больш за 50 фермаў ужо рабатызаваныя.

**Акрамя таго, выпрабавальная база новых магчымасцяў беларускіх тэхналогій створана на Сахаліне. «Там пабудаваны малочнатаварны комплекс па беларускай тэхналогіі на тысячу галоў. У наступным годзе мы туды паставім сваю жывёлу і забяспечым суправаджэнне тэхналогіі», — растлумачыў Леанід Заяц.**

## МАДЭРНІЗАЦЫЯ Ў ПАШАНЕ

Міністэрства працуе над паляпшэннем вытворчасці і павышэннем якасці прадукцыі. Асноўныя напрамкі — павышэнне ўзроўню перапрацоўкі сельскагаспадарчай сыравіны, вытворчасць прадукцыі высокай якасці, запатрабаванай на ўнутраным і знешнім рынках. З гэтай мэтай пастаянна праводзіцца работа па тэхніка-тэхналагічным забеспячэнні цэхаў, мадэрнізацыі халадзільнай гаспадаркі, стварэнні сучасных упаковачных ліній, сертыфікацыі, укараненні сістэмы менеджменту бяспекі харчовых прадуктаў і іншае, — адзначыў міністр. Таксама, на яго думку, важным напрамкам з'яўляецца тэхнічнае пераасняшчэнне і мадэрнізацыя арганізацый малочнай прамысловасці сыраробных цэхаў, сушыльных установак і мясной прамысловасці. Ідзе работа над паляпшэннем існуючых магчымасцяў мясакамбінатаў, кампрэсарных цэхаў і халадзільнікаў. Узводзіцца ачышчальныя збудаванні, мадэрнізуюцца кацельні, пераабсталёўваюцца каўбасныя і паўфабрыкатныя цэхі.

Словам, вялікая праца адпавядае вялікім задачам.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

---

КУЗНЯ КАДРАЎ

# Калі «аграном» будзе гучаць?

**ПРАЦАВАЦЬ па аграпрамысловых прафесіях заўсёды было даволі цяжка: залежнасць ад надвор'я, у сезон — звышурочная работа, а заробак — самі ведаеце... Тым не менш у Беларускай дзяржаўнай сельгасакадэміі ў Горках заўсёды закрываюцца бюджэтныя месцы (апошні раз яны заставаліся вакантныя ў 2014 годзе), а на некаторыя спецыяльнасці трымаецца добры конкурс.**

Сёлета тыя, хто абраў для сябе дзённую форму навучання, падавалі дакументы на 21 спецыяльнасць. Самы вялікі попыт быў на «Правазнаўства» — 3,3 чалавека на бюджэтнае месца. На спецыяльнасць «Эканоміка і арганізацыя вытворчасці ў галінах аграпрамысловага комплексу» — 1,9, «Маркетынг», «Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт», «Фінансы і крэдыт» — 1,6, паколькі напрамкі агранамічнага і інжынернага профілю прапаноўвалі даволі шмат месцаў для абітурыентаў, то на іх конкурс застаўся на ўзроўні 1,1 чалавека на месца.

Як нам паведамілі ў прыёмнай камісіі акадэміі, на завочную форму прымаюць каля 1100 чалавек, пры гэтым дакументы падаюць каля 2000. Узровень набраных балаў «дзённых» студэнтаў і завочнікаў прыкладна аднолькавы. У гэтым годзе для абітурыентаў сельскагаспадарчых спецыяльнасцяў дзённай формы навучання з'явілася магчымасць здаваць альбо ЦТ, альбо ўступныя іспыты адразу ў ВНУ. Завочнікі па такой схеме паступаюць ужо даўно, бо многім тым, хто працуе, нязручна ездзіць летам на тэсціраванне.

Да таго ж зараз у акадэміі вучыцца 356 замежных студэнтаў. Большасць — з Туркменістана, 16 — з Кітая, 5 — з Расіі, 4 — з Узбекістана, па двое — з Украіны, Манголіі, Пакістана, па адным — з Казахстана, Кыргызстана, Нігерыі і Руанды.

Зараз падрыхтоўка спецыялістаў ідзе ў адпаведнасці са




Фота БЕЛТА.

**Падчас доследаў па адаптацыі раслін да падвышанай вільготнасці ў клімакамеры.**

стандартамі трэцяга пакалення — яны з'яўляюцца практыка-арыентаванымі. Пакуль дзейнічае стары Кодэкс аб адукацыі, асаблівых змен у адукацыйны працэс уносіць не плануецца. Тым не менш ужо існуюць пэўныя напрацоўкі да стандартаў пакалення 3+. Напрыклад, новы класіфікатар спецыяльнасцяў і кваліфікацый.

Увогуле, у аграрных ВНУ доля практыкі моцна павялічана. У прыватнасці, у горацкай сельгасакадэміі на некаторых спецыяльнасцях да 60% навучальнага часу аддадзена пад практычныя занятні. Яшчэ больш павялічваць гэты час, мабыць, не зусім рацыянальна, лічаць у навучальнай установе. Лепш павышаць якасць: напрыклад, больш набліжаць навуку да вытворчага працэсу. Сёння не на кожнай гаспадарцы атрымліваецца арганізаваць добрае праходжанне практыкі, на прыватных у тым ліку. Усё залежыць яшчэ і ад кіраўніка: некаторыя з задавальненнем запрашаюць да сябе моладзь, а іншыя не могуць забяспечыць належны ўзровень. Але ў самай Белсельгасакадэміі ёсць уся неабходная база для падрыхтоўкі спецыялістаў: доследчае і навучальныя палі, ферма, палігон, біятэхналагічная лабараторыя і інш. Штогод база абнаўляецца, таму аснашчэннем у ВНУ задаволены.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

ДЫЯЛОГІ «МС»

# НЕ КОЖНЫ ВЫТРЫМАЕ ГЭТЫ ТЭМП



**Ніна Жалязнова — пра сучасныя падыходы ў сельскай гаспадарцы**

На тэрыторыі «Азярыцкага-Агра» знаходзіцца сучасны зернесушыльны комплекс «Кудрышчына».



**ЦЯПЛІЦЫ, палеткі, больш за шэсць тысяч пагалоўя буйнарагатай жывёлы, база адпачынку «Сасновая», 340 гектараў воднай гладзі і парк «Дубрава»... Каля 500 работнікаў. У Смалявіцкім раёне «Азярыцкі-Агра» — гэта цэлая сельскагаспадарчая «краіна» ў краіне. І, хочацца сказаць, адна з самых паспяховых у рэспубліцы. Кіраўнік гэтай гаспадаркі і намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Ніна ЖАЛЯЗНОВА лічыць, што такое развіццё за апошняе дзесяцігоддзе не магло стаць магчымым без пастаяннага ўкаранення новых тэхналогій. Іх у «Азярыцкім-Агра» выкарыстоўваюць у асноўным з 2008 года. З таго часу і стала відавочна, што эфектыўнасць працы ў сельскагаспадарчай вытворчасці напрамую залежыць ад інавацый.**

### Пытанне не толькі прыбытку, але і працоўных месцаў

Першыя інавацыі ў гаспадарцы былі прыменены на цяплічным камбінаце. З 2006 па 2008 гады для яго будавалася новая кацельня, дзе выкарысталі найлепшае энергаэфектыўнае абсталяванне. Камбінату ўжо, як даросламу, сталаму чалавеку, — 34 гады, хоць лічыцца, што тэрмін яго амартызацыі — да 25 гадоў. На думку Ніны Жалязновай, сакрэт — у клапатлівым стаўленні спецыялістаў і тэхналагічнай эксплуатацыі камбіната службамі. У 2009—2010 гадах адбылася яго рэканструкцыя. З-за таго, што канструкцыі цяпліц (напрыклад, вышыню) змяніць немагчыма, памянялі тэхналогію догляду раслін.

> Як кіраўнік сельскагаспадарчага прадпрыемства, лічу, што ў краіне і сярод чыноўнікаў не хапае аналітыкаў, эканамістаў, тэхнолагаў, здольных даць параду, як лепш арганізаваць вытворчасць у тым ці іншым напрамку.

«Зразумела, што мы не можам з-за высокай цаны на энерганосьбіты параўноўваць сябе па сабекошце прадукцыі са шчодрымі на сонца краінамі, але затое якасць нашай агародніны такая, што яе з ахвотай забіраюць пакупнікі, — дзеліцца кіраўнік. — Да таго ж зараз на цяплічным камбінаце працуе каля 100 чалавек, 75 з якіх — жанчыны. Іх сярэдні ўзрост — 42 гады. Сярод іх многа маладых мам, шмат хто зараз у дэкрэтным адпачынку. Гэта амаль кожная пятая сям'я нашай гаспадаркі. І мы разумеем, што без работы, без прымянення сваіх прафесійных навыкаў, здольнасцяў, без заробкаў ім будзе няпроста. Таму стараемся прадоўжыць тэхналагічнае жыццё цяплічнага камбіната да таго часу, пакуль не зможам прыступіць да будаўніцтва новага».

Выкарыстоўваюцца новыя падыходы ў гаспадарцы і ў адкрытым грунце: у вырошчванні і захоўванні морквы, буракоў, бульбы. У 2013 пабудавалі новае, адпаведнае сучасным тэхналагічным патрабаванням бульбасховішча на 10 тысяч тон, да таго ўжо былі пабудаваны сховішчы больш чым на тры тысячы тон (у гаспадарцы вырошчваюць каля 12 тысяч тон бульбы і прыкладна тысячу тон іншай агародніны). «Зараз яны цалкам запоўнены. Такім чынам мы можам зберагчы выкапаны ўвосень ураджай да вясны. Гэтую прадукцыю ў нас набываюць не толькі беларусы, але і пакупнікі з Узбекістана, Казахстана, Сербіі, Расіі», — расказвае Ніна Вікенцьеўна.

### Тэхналогіі вучаць самадысцыпліне

Сельскагаспадарчая энергаёмкая тэхніка, якая працуе на палетках «Азярыцкага-Агра», — беларуская, амерыканская, нямецкая, галандская. «Таму ў нашых механізатараў ёсць магчымасць параўнання. Беларуская тэхніка, хачу адзначыць, з кожным годам становіца ўсё лепшай, — кажа Ніна Жалязнова. — Трэба разумець, што замежныя брэнды існуюць стагоддзямі: у іх назапашана больш вопыту. А айчынная тэхніка пачала сваё самае інтэнсіўнае развіццё ў апошнія дзесяцігоддзі. Прыйдзе час — і беларуская сельскагаспадарчая тэхніка стане канкурэнтаздольнай у параўнанні з сусветна вядомымі маркамі».

На кожным трактары ў «Азярыцкім-Агра» ўстаноўлена сістэма даследавання расходу паліва і кірунку праезду — GPS. Кантралюе яе інжынер-эканаміст: ён мае электронны банк даных, у які ўнесена кожная адзінка тэхнікі, што працуе на палях. Да гэтай сістэмы была дапрацавана электронная карта палёў, у якой ёсць іх контуры, плошча. «У нас больш за 500 палеткаў, працягласць гаспадаркі да 60 кіламетраў. На кожны від работы нелагічна займаць брыгадзіра, які будзе ездзіць і перамяраць, хто колькі ўзараў, пасеяў... Акрамя таго, мы маем магчымасць аналітычна падысці да работы: пралічваем, як лепей арганізаваць працу тых, хто знаходзіцца далёка ў полі. Ці прапаноўваем кіроўцу адпрацаваць большую колькасць гадзін за дзень, але і атрымаць большую зарплату, ці пакінуць неўзараны ўчастак на наступны дзень, ці перайсці на іншыя палеткі, дапамагчы калегам. Гэта вучыць самакантролю і адказнасці механізатараў», — дзеліцца вопытам Ніна Жалязнова.



Таццяна ТАБОЛІЧ, агароднік цяплічнага камбіната гаспадаркі.

### Без падзяжу і з высокімі ўдоямі

«У 2010 годзе мы былі другія ў краіне, хто ўвёў жывёлагадоўчы малочнатаварны комплекс для дойнага статка на 1000 галоў. Ён быў пабудаваны за кошт сродкаў нашага ўласніка — Белаграпрамбанка, а пасля перададзены нам у якасці матэрыяльнай падтрымкі. З таго часу комплекс наведала больш за 200 дэлегацый з розных прадпрыемстваў, якія вучыліся, як тэхналагічна выкарыстоўваць у сябе новую на той час тэхналогію. За сем гадоў малочнатаварны комплекс акупіў сябе не выручкай, а прыбыткам ужо на 98%. Хоць тэрмін акупання да 12 гадоў», — расказвае кіраўнік «Азярыцкага-Агра».

Удоі ў гаспадарцы добрыя — за год больш за 8 тысяч літраў малака на карову, а іх — 2360 галоў.

> На кожным трактары ў «Азярыцкім-Агра» ўстаноўлена сістэма даследавання расходу паліва і кірунку праезду — GPS. Да гэтай сістэмы была дапрацавана электронная карта палёў, у якой ёсць іх контуры, плошча.

Якасць малака — 100% гатунку «экстра». Тут жа працуюць дзве ўласныя лабараторыі па даследаванні якасці малочнай прадукцыі. У асноўным яна ідзе на завод «Здравушка», што ў Барысаўскім раёне. На думку кіраўніка прадпрыемства, таксама важна выбраць фірмы-партнёры, якія ў далейшым будуць суправаджаць пэўныя кірункі работы гаспадаркі.

Раней у «Азярыцкім-Агра» існавала 14 фермаў, цяпер — 8. Пагалоўе статка з моманту гэтых змен павялічылася амаль на тысячу галоў. Прыбаўленне буйной рагатай жывёлы ў вазе значна павялічылася, амаль няма падзяжу — усё гэта таксама вынікі выкарыстання новых тэхналогій. «Старым фермам, некаторым з якіх было больш за 50 гадоў, мы далі новае жыццё: рэканструявалі, змянілі тэхналогію кармлення і ўтрымання на глыбокай падсцілцы. Цяпер бычкі вырастаюць за 12 месяцаў і важаць больш за 420 кілаграм. Захаванасць маладняку цялушак і тэхналагічнае ўтрыманне дае магчымасць займацца племпродажам. За 5 гадоў мы прадалі амаль 2 тысячы галоў для запаўнення малочнатаварных комплексаў Мінскай вобласці і краіны. — Сярэдні ўзрост адной каровы — пяць лактацый. А гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў нават па еўрапейскіх мерках, — кажа Ніна Вікенцьеўна. Увогуле, у сучасным свеце сельскую гаспадарку без новых тэхналогій уявіць немагчыма».

### Найлепшыя інавацыі — сумленныя працаўнікі

І ўсё ж такі ў краіне яшчэ ёсць стратныя гаспадаркі. Чаму? Справа ў недастатковым фінансаванні, нежаданні працаваць ці нядобрасумленным стаўленні? «Мяркую, што праблема — у сістэме падпарадкавання. Не павінен горад кіраваць сялом, ёсць у гэтым нешта штучнае, — лічыць дырэктар «Азярыцкага-Агра». — Як кіраўнік сельскагаспадарчага прадпрыемства, лічу, што ў краіне і сярод чыноўнікаў не хапае аналітыкаў, эканамістаў, тэхнолагаў, здольных даць параду, як лепш арганізаваць вытворчасць у тым ці іншым напрамку. Напрыклад, мы часта атрымліваем указанні: калі, што і ў якой колькасці гаспадарцы трэба зрабіць. Але, па шчырасці, дадзеныя паказчыкі не заўжды супастаўныя з рэчаіснасцю.

**Гаспадарка з задавальненнем нават даплаціла б чыноўнікам-спецыялістам, якія б не толькі даводзілі выкананне тых ці іншых паказчыкаў, а выступалі як кансультанты, партнёры ў справе, якую мы робім разам. Такія спецыялісты былі б на вагу золата».**

На думку Ніны Жалязновай, крыніца поспеху ў любой справе — дысцыпліна. І задаваць яе павінен кіраўнік. «Сакрэт яшчэ і ў сімбіёзе паміж маладым пакаленнем і сталым. Старэйшым важна падтрымліваць ініцыятыву маладых, маладым — вучыцца вопыту ў сталых. Я з вялікай любоўю стаўлюся да моладзі, што прыходзіць да нас. Для гаспадаркі — гэта «свежы подых» у калектыве, а для маладых спецыялістаў — магчымасць пераняць веды, якія ў тэорыі ніяк не атрымаеш. Яны праходзяць нашу школу працы, а гэта ж таксама інавацыі, якія нідзе не зарэгістраваны. А чым больш інавацый, новых тэхналогій, тым цікавей і эфектыўней працаваць».

* * *

Для таго каб уладкавацца на працу ў «Азярыцкі-Агра», людзі прыязджаюць з усіх абласцей краіны. Але на пастаянную работу застаюцца адзінкі. Ніна Вікенцьеўна лічыць, што многія папросту не вытрымліваюць тэмпу. Каб механізатар мог мець зарплату да 2000 рублёў, трэба працаваць не 7 гадзін, а перавыконваць нормы з выдатнай якасцю. «Сапраўдны адказны работнік прыйдзе на працу загадзя, застанецца пасля заканчэння працоўнага дня, каб дагледзець тэхніку, за якую адказвае», — кажа Ніна Жалязнова. Такая эфектыўная работа і адказнае стаўленне да справы не толькі па-чалавечы, але і грашова высока цэніцца.

**Высокакваліфікаваны спецыяліст і жыллё атрымае, і сям'я яго будзе добра ўладкавана. Але перадусім тут — адказнасць, сумленнасць і працавітасць чалавека. І матывацыя — не толькі зарабіць грошы, але і выканаць даручаную справу годна, каб не падвесці калектыў.**

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
pustavit@zviazda.by

*Смалявіцкі раён.*



У гаспадарцы высокія паказчыкі па надоях — больш за 8 тысяч літраў малака ў год ад адной каровы. Фота бурых зроблена на малочнатаварным комплексе «Задомля».

ПРАБЛЕМА І РАШЭННЕ

# ДЗЕ ШУКАЦЬ ГЕН ВЫНОСЛІВАСЦІ?

**Сучасныя тэхналогіі дапамагаюць атрымаць «вялікае малако», але скарачаюць каровін век**

**ЖЫВЁЛАВОДЫ адмовіліся ад выпасу кароў. На змену традыцыйнаму выгулу прыходзяць новыя тэхналогіі. Паводле іх, статак знаходзіцца ў межах комплексу і атрымлівае збалансаваныя кармы. Надоі імкліва ідуць уверх. А вось прадукцыйны перыяд зніжаецца — і малочныя рэкардсменкі праз 3—4 гады выходзяць са строю.**


Комплекс «Цэнтральны» СВК «Свіслач».

У Гродзенскай вобласці з кожным годам павялічваюцца надоі. Вось і сёлета прадукцыйнасць дойнага статка ўзрасла на 31 кг ад каровы. За год плануецца атрымаць ад каровы 5,3 тыс. кг малака, паведамілі ў абласным упраўленні сельскай гаспадаркі і харчавання. Але і гэта не мяжа. Спецыялісты падлічылі, што генетычны патэнцыял дойнага статка ў вобласці дазваляе атрымаць больш за 7 тыс. кілаграм, а ў некаторых раёнах, у першую чаргу ў Гродзенскім, ажно 9 тыс. кг ад каровы. Рэкорды ў надоях ставіць СВК «Свіслач» — адна з племянных гаспадарак Гродзенскага раёна. Да канца года тут мяркуюць дасягнуць 9,5 тыс. кг малака на карову. Спрыяе гэтаму актыўнае ўкараненне новых сучасных тэхналогій, дзе арганізацыя працы і культура вытворчасці знаходзяцца на ўзроўні высокаразвітых краін.

На комплексе «Цэнтральны» СВК «Свіслач» пастаянна нешта ўдасканальваюць. Не так даўно адрамантавалі і запусцілі даільную залу з імпартным абсталяваннем. Тут традыцыйна аддаюць перавагу так званай паралелі. Але гэта справа дзясятая. Першнаперш трэба сфарміраваць статак. У гаспадарцы самая малочная парода — гальштына-фрызская. Статак пастаянна паляпшаецца высокапрадукцыйным семем, якое закупляецца за мяжой. Тут нямала рэкардсменак, якія бралі прызавыя месцы на выстаўцы «Белагра». Галоўны заатэхнік Міхаіл Павядайка пералічвае мянушкі пераможцаў апошніх гадоў — Мілка, Дыядэма, Вікторыя... Не ўсе яны сёння ў складзе статка. Дарэчы, Мілкі не стала неўзабаве пасля конкурсу. Кажуць, гэта вынік стрэсавай сітуацыі. А вось другая рэкардсменка Дыядэма нядаўна нарадзіла двойню, у хуткім часе павінен з'явіцца прыплод і ў Вікторыі, якая ў гэтым годзе заняла першае месца ў сваёй катэгорыі на конкурсе. Па каровініх мерках яна яшчэ маладая — усяго каля пяці гадоў, ці трэцяя лактацыя (перыяд, калі карова дае малако). У гаспадарцы працуюць над тым, каб гэты перыяд павялічыць, кажа Міхаіл Павядайка. Па словах спецыяліста, карова разам з малаком аддае шмат пажыўных рэчываў, яна высільваецца, а значыць, трэба правільна папаўняць гэты запас. Таму тут адкрылі камбікормавы цэх і ўдасканальваюць рэцэптуру кармлення. Пад кожны перыяд лактацыі — сваё меню.

Па-другое, удзяляюць увагу актыўнаму мацыёну дойнага статка. Як расказаў галоўны заатэхнік, за фермай нават пракладзена трасу ў 1,5 км, па якой гуляюць «дэкрэтныя» жывёлы, умацоўваючы мышцы і звязкі. І гэта дае свой плён. Калі раней у сярэднім па гаспадарцы было 3,7 лактацыі, то зараз — 5,7.

**І ўсё ж высокая прадукцыйнасць адбіваецца на здароўі кароў. Штогод больш чым трэцяя частка статка аднаўляецца. Не ўсе жывёлы, асабліва гэта цяжка для маладых, вытрымліваюць такі тэмп, таму і сыходзяць з дыстанцыі.**

Гэта датычыцца ўсяго рэгіёна. Дарэчы, па вобласці «малочны» перыяд дойнага статка невялікі — усяго каля трох лактацый. Гэта 4—5 гадоў. Генеральны дырэктар Гродзенскага племпрадпрыемства Пётр Кашталян падкрэсліў, што над гэтым пытаннем працуюць навукоўцы. У прыватнасці, выкарыстоўваецца сусветны вопыт уплыву генэтыкі на даўгалецце. У большай ступені ген вынослівасці (тэрмін цалкам рэальны) мае дачыненне да бычкоў-вытворцаў. У мінулым годзе ў Еўропе закуплена 8 геномна ацэненых быкоў, кошт аднаго дасягае 7 тыс. еўра. Гэта сведчыць аб важнасці пераносу славутага гена.

У практыкаў ёсць і свае меркаванні наконт даўгалецця кароў. На адным з конкурсаў па ўзнаўленні дойнага статка, які штогод праходзіць у Гродзенскім раёне, маладыя спецыялісты па штучным асемяненні выказалі думку наконт негатыўнага ўздзеяння на жывёлу бяспрыв'язнага ўтрымання. Маўляў, ад гумовага пакрыцця пакутуюць ногі і капыты. А далёка не ўсюды ўстаноўлены станкі для іх расчысткі. Не спрыяе здароўю і цесната на выгульных пляцоўках. Іншая рэч — свабодны выпас! У гаспадара па такой «тэхналогіі» карова давала малако не 3—4 гады, а 15—20.

Інавацыі спрабуюць наблізіць нашу карміліцу да натуральных умоў. Адна з такіх цуда-ферм знаходзіцца ў СВК «Прагрэс-Верцялішкі». Тут сем гадоў таму ўведзены рабатызаваны комплекс, на якім карова доіцца тады, калі сама захоча. Пры гэтым робат яе стымулюе кормам. Але падманухць яго нельга. Аўтаматыка выдае, калі адбылася дойка, і зноў карову не прыме. Такіх робатаў тут 16 — яны і вымя памыюць, і масаж зробяць. А каб падоўжыць светлавы дзень, робаты абсталяваны ўльтрафіялетавымі лямпамі — замест сонечных праменяў, расказвае загадчык комплексу Сяргей Карпач.

На падлозе гумовы насціл галандскай вытворчасці. І надоі тут еўрапейскага ўзроўню. У сярэднім на комплексе атрымліваюць больш за 10 тыс. кг малака на карову (іх тут 300). А вось вытрымліваюць жывёлы такі тэмп не доўга — усяго 2—3 лактацыі. Калі на выпасе знаходзіліся, тэрмін быў у чатыры разы даўжэйшы, заўважае загадчык фермы. І сёння гэтага можна дабіцца, калі выпусціць статак на поле. Бо карове патрэбен рух, адзначае Сяргей Карпач, яна павінна праходзіць у дзень каля двух кіламетраў. Да таго ж карова аддае з малаком значную частку сваіх мікраэлементаў. Іх абавязкова трэба папаўняць.

Безумоўна, новыя тэхналогіі робяць стаўку на «вялікае малако». І гэта сябе апраўдала — надоі значна выраслі. Каб трымаць планку па малаку, трэба пастаянна павялічваць статак. І ён у маштабах вобласці расце з году ў год, хоць і звязаны з пэўнымі затратамі. Бо выгадаваць новую карову даражэй, чым утрымліваць тую, што ёсць.

Вяртанне да дзедаўскага спосабу ўтрымання наўрад ці адбудзецца, лічаць спецыялісты Гродзенскага племпрадпрыемства, але яны згодныя з тым, што некаторыя моманты неабходна падкарэктаваць. Напрыклад, летам выпускаць на выпас уразлівыя групы кароў, у тым ліку пасля расцёлу.

**Загадчык фермы Сяргей Карпач у сваіх меркаваннях катэгарычны: каб карова не толькі давала малако, але і мела добрую рэпрадуктыўную функцыю, яе трэба выпускаць на луг. Ад расы яе ногі і капыты будуць чыстыя, а значыць, здаровыя. Тады і век карміліцы падоўжыцца.**

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

ІНВЕСТЫЦЫІ Ў ГЛЫБІНКУ

# «Па пяцьсот» плюс бонусы

**Багатых людзей і буйныя фірмы нашай краіны не раз заклікалі ўкладваць грошы ў беларускую глыбінку. Тым больш што пры гэтым гарантуюцца падтрымка, прэферэнцыі на розных узроўнях улады, у тым ліку і мясцовым. Словам, інвестарам у нас — «зялёнае святло».**


Леанід ГАРДЗЕЦКІ, дырэктар філіяла «Віраўлянскі» замежнага прадпрыемства «Дзецкасельскі–Гарадок».

**Таму і не дзіўна, што з кожным годам маем усё больш прыкладаў, калі інвестыцыі, у тым ліку і з-за мяжы, накіроўваюцца ў сельскую гаспадарку. У прыватнасці, у Гарадоцкім раёне Віцебскай вобласці расійская сельскагаспадарчая кампанія «Канцэрн «Дзецкасельскі» заснавала сваё прадпрыемства. Канцэрн створаны ў Ленінградскай вобласці ў 2007 годзе. Ён працягвае традыцыі аднайменнага саўгаса, які пачаў функцыянаваць больш за 80 гадоў таму.**

Сёння кампанія аб'ядноўвае больш за два дзясяткі прадпрыемстваў на тэрыторыі Санкт-Пецярбурга, Ленінградскай і Варонежскай абласцей, а таксама Беларусі. У яе структуры — агракомплексы, перапрацоўчыя заводы, гандлёвыя дамы (у тым ліку расійска-беларускі), фірменная гандлёвая сетка. Галаўны офіс — у Санкт-Пецярбургу.

А ў вёсцы Віраўля Гарадоцкага раёна пабудаваны з нуля комплекс на 1200 галоў буйной рагатай жывёлы пачаў функцыянаваць у 2010 годзе. У суткі тут надойваюць каля 45 тон малака. І гэта не мяжа, паколькі ўведзены сёлета яшчэ адзін комплекс пакуль працуе не на поўную магутнасць. Як растлумачылі спецыялісты, ідзе працэс запаўнення жывёламі...

Першапачатковa ўпор быў зроблены на передавыя тэхналогіі жывёлагадоўлі. Выкарыстоўваецца папулярны ў многіх краінах метад — бяспрывязнае ўтрыманне кароў. Жывёлы цэлы год знаходзяцца ў залах для ўтрымання, сілкуюцца збалансаванымі па рацыёне кармамі. Дарэчы, у гаспадаркі свае палі, дзе вырошчваюць кармы. А для даення кароўкі перасоўваюцца ў адпаведную залу.

Па словах **Леаніда ГАРДЗЕЦКАГА, дырэктара філіяла «Віраўлянскі» замежнага прадпрыемства «Дзецкасельскі-Гарадок»**, за кошт дакладнага разумення заатэхнічных нормаў і тэхналогій, правільнай арганізацыі працэсу тут атрымліваюць рэкордныя вынікі. І не толькі па колькасці, але і па якасці малака.

Дарэчы, надой з адной каровы — больш за 23 літры ў суткі. Гэта вышэй, чым у сярэднім па Віцебскай вобласці. Малако самага высокага класа «экстра».

Як вядома, расіяне некалькі разоў бракавалі малако з Беларусі, але ў «чорным спісе» ніколі не было згаданай гаспадаркі.

Што ж да ўмоў працы ў Беларусі, яны прывабныя: такія ж, як і для беларускіх прадпрыемстваў.

Цікава, што яшчэ на стадыі праектавання комплексу разглядалася магчымасць выкарыстання робатаў для даення. Але перавага ўсё ж аддадзена людзям, а не машынам.

— І не памыліліся! Пашырэнне вытворчасці — гэта стварэнне новых працоўных месцаў, працаўладкаванне са стабільным высокім заробкам, магчымасць падтрымання годнага ўзроўню жыцця! — канстатуе кіраўнік.

Працавітых і добрасумленных работнікаў у «Віраўлянскім» сапраўды цэняць. Найлепшыя даяркі даўно ўжо зарабляюць больш за 500 долараў у эквіваленце.

Супрацоўнікі, акрамя высокай зарплаты, атрымліваюць «бонусы». Арганізавана бясплатнае харчаванне ў сталовай прадпрыемства. Людзей прэміруюць напярэдадні асабістых і дзяржаўных свят. Асобна налічваюць прэміі, калі філіял выходзіць у лідары сярод прадпрыемстваў канцэрна. Для ўшанавання перадавікоў запрашаюць штогод у паўночную сталіцу Расіі на свята ўраджаю.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*



# ССЕКЧЫ АБО ПАМІЛАВАЦЬ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Возьмем сквер Котаўка. Вясной там быў выдалены шэраг дрэў з прычыны іх небяспечнасці, а ўжо ў верасні два дрэвы пры моцным парывістым ветры паваліла. Дастаткова было паглядзець на іх, каб зразумець, што яны відавочна ў аварыйным стане. І тут узнікае пытанне да прафесіяналізму супрацоўнікаў «Зялёнбуда» Першамайскага раёна сталіцы: якім чынам яны выявілі тыя 15 дрэў, не звярнуўшы ўвагі на гэтыя? Адпаведна, пачынаеш задумвацца: а ці былі тыя дрэвы аварыйныя?





**Высечка дрэў па вуліцы Цэнтральнай у Мінску: да і пасля.**

І ўсё ж чалавечы фактар выключыць нельга ні ў адной сферы. Па словах **кіраўніка службы па добраўпарадкаванні і ўтрыманні аб'ектаў гарадской гаспадаркі УП «Мінскзялёнбуд» Анжалікі ПУЗАНКОВАЙ**, перад пачаткам работ усіх супрацоўнікаў прадпрыемстваў папярэджваюць пра адказнасць за нанесеную шкоду. Прычым супрацоўнікі замацоўваюць прынцыпе такіх умоў асабістым подпісам. Каб кантраляваць сітуацыю, рэгулярна праводзяцца аб'езды, ды і грамадскасць не маўчыць.

Тым не менш сёлета ў Маскоўскім і Першамайскім раёнах мелі месца выпадкі недапушчальных парушэнняў, за што пакараныя як кіраўнікі і майстры, так і самі работнікі, у тым ліку з асабістым пакрыццём нанесенай шкоды.

## «Белая смерць» для дрэў

І калі прафесіяналізм супрацоўнікаў арганізацый, якія выконваюць названыя работы, можна ўдасканальваць, то паўплываць на іншыя фактары значна складаней — рытм жыцця мегаполіса не мяняецца па шчаўчку пальцаў.

Яшчэ 15 гадоў таму галоўнымі ворагамі сталічных дрэў, «прапісаных» уздоўж цэнтральных вуліц, былі выхлапныя газы — больш за ўсё пакутавалі пасадкі каля пешаходных пераходаў і святлафораў. Зараз жа значна большую пагрозу ўяўляе так званая белая смерць — соль, якой пасыпаюць вуліцы зімой. На двух цэнтральных праспектах — Незалежнасці і Пераможцаў — перавышэнні па колькасці солі — у 17—23 разы, на праспекце Дзяржынскага — у 8 разоў. Атрымліваецца, саджай не саджай, высечкі непазбежныя? Гэта пры тым, што для падтрымання нармальнай жыццядзейнасці дрэў праводзіцца столькі працэдур, колькі не снілася нават дамам, якія рэгулярна наведваюць спасалоны. Аднак, па сутнасці, эфектыўнасць гэтай работы непазбежна імкнецца... да нуля.

Напрошваецца лагічная высноwa: калі гара не ідзе да Магамета... то трэба мяняць не сістэму догляду, а самі проціголалёдныя рэагенты. Аднак пытанне ўпіраецца ў фінансы: адходы Салігорскага камбіната, якія ўяўляюць сабой злучэнне натрыю і хлору, занадта прывабныя па цане, каб ад іх адмаўляцца.

— Раней была норма па выкарыстанні солі на метр квадратны, цяпер яе няма. Таму сыплюць не шкадуючы — бяспека важнейшая. Да таго ж амаль чыстую соль. А да гэтага яна складала ўсяго 10% у сумесі з пяском. А калі мы прапануем дзеля той жа бяспекі знізіць хуткасны рэжым — рэакцыі няма. Усе іншыя рэагенты, напрыклад кальцыйн хлор, які выкарыстоўваюць у Маскве, каштуюць значна даражэй. Адна французская кампанія прапаноўвала нам сваё рэчыва — па долары за кілаграм. Высыпаць 5 мільёнаў долараў толькі на адну кальцавую дарогу, вядома, не дазваляе бюджэт. Патрэбна ўласная эксперыментальная праца, — заўважыў **загадчык сектара маніторынгу расліннага свету Інстытута эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі, кандыдат біялагічных навук Аляксандр СУДНІК.**

Выслухаўшы такія довады, пачынаеш задумвацца: дык, можа, не мучыць ні дрэвы, ні людзей і хоць бы часова спыніць пасадкі? Але спецыялісты не здаюцца: дрэвы, ахвяруючы сабой, хоць неяк абараняюць нас ад шкодных рэчываў. Так, лістота, якую ўзялі на аналіз каля дарогі, паказала практычна ўсю табліцу Мендзялеева.

— Што да праспекта Незалежнасці, то, паколькі гэта аб'ект Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, на ім павінны расці ліпы. Гэта парода не солеўстойлівая, аднак прыходзіцца выкарыстоўваць менавіта яе. Сітуацыя складаная, але не крытычная: напрыклад, у мінулым годзе на працягу ўсяго праспекта мы выдалілі 23 дрэвы. Калі гаварыць пра праспект Пераможцаў, то тут мы вырашылі адмовіцца ад каштанаў. Здаровыя не прыбіраем, але выдаленыя новымі не замяняем. Лепш за ўсё для цэнтра падыходзяць такія солеўстойлівыя пароды, як вяз, ясень, дуб чырвоны, — расказала Анжаліка Пузанкова.

## Я садоўнікам нарадзіўся...

Каб не было спрэчных момантаў накont «секчы ці не секчы», спецыялісты Нацыянальнай акадэміі навук сумесна з калегамі з Інстытута эксперыментальнай батанікі і Цэнтральнага батанічнага сада распрацавалі інструкцыю на 40 старонак па вызначэнні аварыйнасці і жыццёвага стану дрэў. Так што, калі высечка ўсё ж ідзе, хутчэй за ўсё, для яе ёсць навуковае абгрунтаванне. Іншая справа — што адбудзецца далей. Раней замест аднаго дрэва садзілі дзесяць, цяпер альбо адно, альбо тры ў залежнасці ад розных фактараў. А ім жа і прыжывацца складаней... Акрамя таго, у горадзе выкарыстоўваюць толькі стандартны пасадачны матэрыял, невялікі па памерах, які адпавядае даўнім ДАСТам, а вось «буйнамерам» са значна большай магчымасцю выжыць у сталіцы папросту няма месца — знайсці лунку для развіцця каранёвай сістэмы перашкаджаюць пракладзеныя пад зямлёй сеткі.

Калі з цэнтральных праспектаў адысці ўглыб двароў, то праблема паўстае з новага боку. На пярэдні план зноў выходзіць чалавечы фактар. На думку **вядучага навуковага супрацоўніка сектара маніторынгу расліннага свету Інстытута эксперыментальнай батанікі, кандыдата біялагічных навук Ірыны ВАЗНІЧУК**, практычна ўсе пасадкі, што ёсць на дадзены момант у мінскіх дварах, — спадчына савецкага часу. Зараз работа адказных за іх службаў ЖКГ вядзецца не на належным узроўні. Што непазбежна вядзе да сумнага выніку.

Як варыянт вырашэння праблемы Ігар Корзун прапануе ўвесці ў кожнай арганізацыі, якая займаецца гэтай тэмай, пасаду садоўніка. І для ўтрымання карысна, і для эстэтыкі, пра якую гаворка калі і заходзіць, то ў апошнюю чаргу.

Але пакуль тыя ці іншыя нававядзенні закрануць дзяржаўныя арганізацыі, самы час задумацца мясцовым жыхарам пра сваю ролю ва ўсім гэтым працэсе. Бо звычайна ініцыятыва заканчваецца на дубчыку, уторкнутым у загадзя зробленую лунку. Можа, ходкую фразу пра дом, дрэва і сына варта пашырыць: маўляў, дрэва трэба не толькі пасадзіць, але і дагледзець?

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

З НАГОДЫ

# ГРОШЫ З ПАВЕТРА,

## або Нашчадкі пінскай шляхты

**НЕ так даўно атрымала цікавае пісьмо з Камянецкага ЖКГ. У ім гаворыцца: «У сувязі з тым, што вы з'яўляецеся ўласнікам жылога дома, размешчанага на тэрыторыі раёна, у адпаведнасці з пунктам 52 артыкула 12 Палажэння аб парадку разлікаў і ўнясення аплаты за жыллёва-камунальныя паслугі, зацверджанага Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12.06.2014 г. №571, вам неабходна заключыць дагавор на аказанне паслуг па вывазе і абясшкоджванні цвёрдых бытавых адходаў». Да пісьма прыкладзены дагавор.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Гаворка ідзе пра домік у вёсцы, які з'яўляецца дачай. У ім ніхто не зарэгістраваны і не пражывае. Прыязджаем на выхадныя ў летні сезон. Гэтым летам, наогул, мала атрымлівалася прыязджаць, апошні раз мы з сынам былі там 9 кастрычніка адзін дзень без начоўкі. Гэта так, дарэчы.

Азнаёміўшыся з дагаворам, я зразумела, што ён складзены некарэктна. Гэта значыць, дакумент прымушае мяне плаціць за паслугі, якія мне не могуць быць аказаны і якія я не магу спажыць фізічна, бо я там не бываю амаль паўгода. Пра што аўтар гэтых радкоў і паведаміла службовай асобе па тэлефоне. Спецыяліст на тым канцы правода выслухала, спачатку сказала, што як чалавек яна разумее абсурднасць патрабаванняў, але як супрацоўнік службы мусіць выконваць сваю работу. І дапоўніла, што непадпісанне дагавору не вызваляе мяне ад налічэння аплаты. Калі ж я плаціць не буду, то дакументы перададуць натарыусу для спагнання грошай з маіх даходаў. Такім чынам мне папулярна растлумачылі мае правы і абавязкі.

Вось толькі пра натарыуса, здаецца, яна пагарачылася. Прымусіць вылічваць грошы з даходаў можа толькі суд, наколькі я ведаю. Думаю, што суд падтрымае... іх. (Ну і што, што ў названых вышэй дакументах ёсць радок «на падставе дагавора», а калі дагавор не заключаны, то і няма падставы.) Чаму я так пра суд? Таму што тая ж службовая асоба сказала мне, што ніводзін грамадзянін не выйграў гэту спрэчку. Значыць, былі прэцэдэнты.

А цяпер прапаную паглядзець на справу не праз радок дакументаў, а... па-чалавечы. Я зусім не з тых людзей, хто за капейку задушыцца. Тым больш што невялікія грошы просяць. Але ж вельмі не люблю, калі мяне прымушаюць ці, прасцей кажучы, трымаюць за дурня. Ну склалі б дагавор нават з вялікім запасам — скажам, з сакавіка да лістапада — і я падпісала б яго ды плаціла. Іншы раз і выставіла б той пакет смецця за плот (цяпер жа мы ўсё смецце забіраем у Брэст, і яго вывозіць Брэсцкая ЖКГ). Альбо, скажам, сельвыканкам папрасіў бы грошы на любое добраўпарадкаванне тэрыторыі — абавязкова прыняла б удзел. А калі вось так безапеляцыйна патрабуюць плаціць за паветра, то ўзнікае натуральнае супраціўленне. Як казаў наш шматгадовы старшыня абласной выбарчай камісіі: «Памятайце, што залішні ціск на выбаршчыка памнажае галасы «супраць». Так і тут хочацца ўсімі сіламі галасаваць супраць такіх падыходаў. Дарэчы, калі я спытала, як жа быць з тымі ўласнікамі, што жывуць у Расіі, ЗША, Прыбалтыцы і ў лепшым выпадку раз на год наведваюць свае дамы, мне адказалі... ведаеце што? Яны павінны прыязджаць і пакідаць грошы на цэлы год за вываз смецця. А што, добрая схема — як качаць грошы з паветра. Яшчэ ў «Пінскай шляхце» апісана, як бралі штрафы з тых сведак, якія «хуліганства не бачылі і не маглі на яго паўплываць». Нічога, плаціцi як міленькія.

Выходзіць, прыдумана форма ўзносаў, толькі не ў бюджэт краіны, а ў бюджэт канкрэтнай арганізацыі. Цікава, чаму пошта сароміецца ўзяць на ўзбраенне правераны метад? Што маю на ўвазе? У названую вёску, акрамя машыны ЖКГ, якая прыязджае раз на два тыдні, кожны тыдзень паштальён ездзіць. А газету выпісвае, здаецца, усяго адна пенсіянерка на вуліцы. Вось і склалі б адпаведны дакумент, паводле якога — выпісваеш газету ці не — ты абавязаны плаціць пэўную суму паштоваму ведамству за заезд паштальёна.

Логікі, праўда, тут няма, затое абсурду колькі хочаш. Вось толькі з гэтага года ў краіне адмянілі адно абсурднае патрабаванне, якое датычыцца наведвання населеных пунктаў, што ўваходзяць у пагранічную зону. Раней вы мусілі браць дазвол на наведванне родных, якія ў гэтай зоне жывуць. Дазвол, як няцяжка здагадацца, азначаў аплату пэўнай сумы. Калі браць у разлік усю сям'ю, то сума атрымлівалася немаленькая. Скажам, у чым была розніца паміж умоўнымі аднакласнікамі Пецем і Васем, якія жывуць у сталіцы, трыццаць гадоў таму скончылі адну школу, але бацькоўскія хаты знаходзяцца ў вёсках за кіламетр адна ад адной. А розніца такая. Васева вёска трапіла ў пагранічную зону, і ён, едучы на Радуніцу з сям'ёй у шэсць чалавек, павінен быў заплаціць кругленькую суму. А да гэтага яму належала на пошце заказаць даведку ў сельскім Савеце аб тым, што тут яго дом, магілы, потым аплаціць пошліну, затым паехаць у пагранатрад і выпісаць дазвол. У той час як Пеця ехаў з вецярком, сябрамі і сямейнікамі. Дык вось, апісаны парадак з гэтага года адмянілі, цяпер дастаткова мець пашпарт пры сабе.

Так што і мы, дачнікі, павінны на лепшае спадзявацца. Пажывём-пабачым, а можа, і адменяць тую пастанову? Сказаў жа кіраўнік дзяржавы нядаўна, што не павінна быць неабгрунтаваных рахункаў за паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

## Цяляты — бясплатна

### Маладняк для падсобнай гаспадаркі атрымалі вяскоўцы ў Ляхавіцкім раёне

**Сертыфікаты на атрыманне маладняку перададзены першым сямі сем'ям у Ганчароўскім сельсавеце Ляхавіцкага раёна. Гэта стала магчыма дзякуючы ініцыятыве, якую рэалізуе Брэсцкі абласны аграпрамысловы саюз у рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». Праект фінансуецца Еўрасаюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН. Сума фінансавання складае 25 060 еўра.**

За гэтыя грошы ў пачатку года купілі 20 высокаўдойных кароў. Яшчэ тры набыла фермерская гаспадарка «Лагуцін», якая з'яўляецца адным з партнёраў ініцыятывы. Каровы знаходзяцца ў гаспадарцы, а прыплод ад іх раздаецца сялянам бясплатна — каб яны маглі развіваць уласную гаспадарку, атрымліваць малако для сваёй сям'і, а лішкі прадаваць.

Паводле ўмоў дагавора, гаспадар даросшчае цяля самастойна, а першую цялушачку ад маладой каровы перадае наступнаму гаспадару. Такім чынам добрая справа працягваецца. Таму ініцыятыва і атрымала назву «Доўгая карова».

І вось конкурс падворкаў прайшоў у Ганчароўскім сельсавеце. Сем сем'яў, якія зарэкамендавалі сябе добрымі гаспадарамі, атрымалі права на маладняк. Так што першая партыя пародзістых цялят перайшла на новае месца жыхарства.

## Адпрацаваны матэрыял

### Нядаўна адправілі на перапрацоўку элементы былых дзіцячых пляцовак, якія знаходзіліся на дваровых тэрыторыях па вуліцы Луцкай у Брэсце

**Пляцоўкі былі асаблівыя, не падобныя на тыя, што ўстанаўліваюць зараз. Яны ўяўлялі сабой жалезабетонныя аркі, рампы, прылады для лажання, на якія не ўсе бацькі адважваліся пускаць дзяцей, нават калі яны былі яшчэ новыя. А цяпер і пагатоў.**

Канструкцыі пакасіліся, фарба на іх злезла, нават вонкавы выгляд навявае сум. Паставілі іх амаль 30 гадоў таму, калі названая вуліца толькі забудоўвалася. Цяпер ужо дзеці, што гулялі побач, водзяць на новыя пляцоўкі сваіх дзяцей. На шчасце, гэтыя новыя ў названым мікараёне ёсць.

Камунальнікі даўно збіраліся прыбраць элементы старых пляцовак, але рукі не даходзілі — пакуль іх не прыспешыла пракуратура. Зараз праведзены дэмантаж жалезабетонных і металічных элементаў, адпрацаваны матэрыял былой інфраструктуры вывезлі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** yackevich@zviazda.by

# АДЗІНОЦЕ ТУТ НЕ МЕСЦА

**Таня з гонарам паказвае святочнае адзенне, якое сама пашыла для лялькі. Магчыма, уменне перадалося ад маці, магчыма, вопыт яна набыла ў майстэрні, але абноўкі для пластмасавых немаўлят атрымліваюцца шыкоўныя. Таня часта гуляе ў сэнсорным пакоі і крыўдзіцца, калі яе захапленне не ўспрымаюць усур'ёз. Пазней мы пазнаёміліся. Аказалася, што адкрытай і цікаўнай дзяўчынцы Таццяне Бурковай 36 гадоў.**

— У кожнага з нашых падапечных свой шлях. Нехта хварэе з дзяцінства, кагосьці хвароба прыводзіць да групы інваліднасці ўжо ў сталым узросце, іншыя атрымалі траўму... Мы вядзём банк даных і кожны квартал яго абнаўляем. Тэлефануем у паліклінікі, на ФАПы, выязджаем у вёскі, дзе ёсць чалавек «нашай катэгорыі», — кажа **Наталля ПРЭЗ, загадчык аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў Тэрытарыяльнага цэнтра сацабслугоўвання насельніцтва Баранавіцкага раёна**.

Першая сустрэча — заўсёды знаёмства. Спецыялісты паказваюць буклеты, расказваюць пра мерапрыемствы, глядзяць у вочы падапечнаму і яго сваякам. Родным таксама патрэбна эмацыянальная разгрузка. Што датычыцца падапечнага, то для яго паездка павінна стаць адпачынкам і шанцам пазбавіцца ад адзіноты.

— Настрой пагаршаецца, калі прыходзяць выхадныя дні. Тут, у цэнтры, добра, а на выхадных сумна сядзець дома без справы. Раней, да траўмы, працаваў без спецыяльнасці, а як трапіў сюды, дык асвоіў тры прафесіі: магу быць брашуроўшчыкам, кветкаводам і краўцом, прычым аб выбары не шкадую. Вельмі прыемна адчуваць, што ты можаш рабіць нешта карыснае. Яшчэ мне падабаецца настольны тэніс, гуляю ў даміно і шашкі, — расказвае сваю гісторыю **Яўген Лапкоўскі**.

Увогуле, аддзяленне дзённага знаходжання ў аграгарадку Жамчужны наведвае 48 чалавек — інваліды I і II групы, пажылыя людзі, якім за 60.



У швейнай майстэрні.

У асноўным гэта практычна самадастатковыя асобы — з сям'ёй, гаспадаркай і абавязкамі. Каб у кожнага з іх быў заняткі пад густ, на базе аддзялення арганізавана 12 гурткоў і дзве майстэрні. Спецыфіка захапленняў скіравана на здаровы лад жыцця, развіццё творчасці, уменне працаваць за камп'ютарам.

Вядома, тэхналагічнай адукаванасці жыхароў у многім спрыяе інфраструктура аграгарадка, дзе ёсць сельвыканкам, ЖЭС, пошта, банк... Жыхары аддаленых вёсачак могуць трапіць у аддзяленне дзённага знаходжання толькі на машыне ад установы, што пэўным чынам абмяжоўвае іх магчымасці. Па словах Наталлі Прэз, прыезд машыны сацыяльнай дапамогі — прыкмета свайго роду статусу. «Ага, да яго прыехалі!» — кажуць аднавяскоўцы. Для падапечных гэта цэлая падзея — перад паездкай чалавек апранае самае лепшае, робіць прычоску, быццам збіраецца ў тэатр, некаторыя нават гатуюць дамашнія стравы з намерам пачаставаць іншых.

У майстэрні бачу цэлую выставку сувеніраў, заколак, брошак — прадукцыю, якую потым можна прадаць. Выручаныя грошы трапляюць на рахунак цэнтра, і на іх набываюць новыя матэрыялы для работы. У камп'ютарным класе падапечных вучаць карыстацца праграмамі, шукаць інфармацыю ў інтэрнэце, трэнажорны зал дазваляе займацца фізічнымі практыкаваннямі, у агульным пакоі наведвальнікі збіраюцца для гульняў, размоў або рэпетыцый — на сценах відаць дыпломы за прызавыя месцы ў творчых і спартыўных конкурсах. Часам падрыхтоўка да іх запамінаецца больш, чым сам удзел. Напрыклад, калі каманда рыхтавала анімацыйную ленту на Міжнародны фестываль аматарскіх фільмаў, то выпадкова ледзь не выклікалі пажарных. Мультфільм «Я ганаруся!» апавядаў пра ваенныя падзеі, патрэбны былі вогненныя спецэфекты. У выніку спрацаваў пажарны апавяшчальнік, затое лента заняла прызавое месца.

— Я не хачу, каб тут была «спецыяльная ўстанова», дзе кожны крок падпарадкаваны рэжыму. Калі абед у нас запланаваны на гадзіну дня, а наш падапечны захоча перакусіць за паўгадзіны да таго, ніхто не стане зачыняць перад ім дзверы на кухню, — тлумачыць спецыфіку працы загадчыца аддзялення.



Анатоль ЦІВУНЧЫК не так даўно адважыўся сесці за камп'ютар.

Дарэчы, пра кухню. Падапечныя ў большасці сваёй маюць агародзікі, таму па чацвяргах яны прыносяць і разам з кіраўніком гуртка «Самавар» гатуюць тут што-небудзь смачнае. Жорсткіх межаў няма: калі па нейкіх прычынах не атрымалася правесці кулінарную сустрэчу ў чацвер, то яе пераносяць на пятніцу перад заплананай экскурсіяй.

— Экскурсіі ладзім не толькі па Баранавіцкім раёне. Выязджаем да суседзяў, наведваем Жыровічы, Тураў. Нашы пенсіянеры вельмі прасунутыя, яны з задавальненнем фатаграфуюцца, а потым выкладваюць фота на віртуальных старонках, падбіраюць да іх вершы-віншаванні. Я ведаю, што некаторыя з іх карыстаюцца скайпам і вайберам, каб трымаць сувязь з дзецьмі, — кажа **спецыяліст па сацыяльнай рабоце Вольга ЛОГВІН**.

Мінулым летам работнікі аддзялення рэалізавалі праект «Працоўная майстэрня для людзей з абмежаванымі магчымасцямі», які атрымаў падтрымку ПРААН. Цяпер двое з падапечных маюць афіцыйнае пацвярджэнне на рамесніцкую дзейнасць. Гэта самы лепшы варыянт, бо людзі з асаблівасцямі часта не могуць упісацца ў графік работы завода, цяжка падстройваюцца пад канвеерную вытворчасць. Рамесніцтва дазволіць ім працаваць дома па вольным графіку.

— Часам даводзілася чуць ад калег, што пажылыя і інваліды цяжка ўжываюцца разам. Для нас такой праблемы не існавала — магчыма, з-за таго, што яны і раней жылі побач як суседзі, аднавяскоўцы, — кажа Наталля Прэз. — Аддзяленне працуе з 2006 года, некаторыя спецыялісты, як і падапечныя, тут з самага пачатку, і гэта таксама важны момант. На мой погляд, самае яскравае пацвярджэнне аўтарытэту — гэта калі падапечны расказвае табе нешта пра сваё захапленне, хоча даznаць тваё меркаванне ці проста частуе салатай, якую сёння прыгатаваў.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** yurgel@zviazda.by

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**
Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**
**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 21 лістапада 2017 года.**